Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

29 СНЕЖНЯ 2021 г. СЕРАДА № 251 (29620)



АДЫХОДЗЯЧЫ ГОД ВАЧЫМА ЭКСПЕРТАЎ 7



ЗАСТОЛЛЕ БЕЗ ШКОДЫ ДЛЯ ЗДАРОЎЯ 11

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксей БАГДАНАЎ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«У лютым 2021 года ўрад прыняў пастанову № 100, якая прадугледжвае жорсткія меры рэгулявання цэн на сацыяльна значныя тавары першай неабходнасці. пастановай № 713 ад 10 снежня 2021 года быў скарэктаваны пералік такіх тавараў, цэны на якія рэгулююцца дзяржавай. Жорсткае рэгуляванне цэн з 15 снежня 2021 года распаўсюджваецца на 29 пазіцый сацыяльна значных тавараў, а таксама 50 пазіцый лекавых сродкаў. Да пытання адмены пастановы № 100 ужо неаднаразова падыходзіў урад. Сёння выпрацаваны нейкія механізмы, якія дазволяць нам гэта зрабіць. У прыватнасці, мне прыемна анансаваць, што з гандлёвымі арганізацыямі ўжо вядзецца перагаворны працэс. У пачатку наступнага года асноўнымі буйнымі гандлёвымі арганізацыямі будзе падпісана пагадненне з урадам нашай краіны».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Галоўнае пытанне для нас — пытанне прагнозу»

## На нефармальным саміце СНД адной з галоўных тэм была барацьба з пандэміяй ковіду

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка з рабочым візітам знаходзіцца ў Расіі. Учора ў Санкт-Пецярбургу ён прыняў удзел у нефармальнай сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц СНД, а на сёння запланаваны перагаворы з расійскім калегам Уладзімірам Пуціным.**



Фота БелТА.

Мерапрыемствы СНД праводзіліся ў Прэзідэнцкай бібліятэцы імя Б. М. Ельцына. Лідары краін падвялі вынікі старшынства Беларусі ў Садружнасці ў 2021 годзе, абмяняліся думкамі па вырашэнні агульных актуальных праблем, абмеркавалі далейшыя меры па павышэнні эфектыўнасці супрацоўніцтва і сацыяльна-эканамічным развіцці краін. Сустрэча знамянальная і тым, што ў снежні споўнілася 30 гадоў з дня ўтварэння СНД. Пра гэта паведамляе прэс-служба Прэзідэнта Беларусі.

Адкрываючы нефармальны саміт, Уладзімір Пуцін падкрэсліў, што бягучы год асаблівы для СНД. Аб'яднаню споўнілася 30 гадоў. «За мінулыя гады і дзесяцігоддзі шмат што кардынальна змянілася. Але само стварэнне арганізацыі было, безумоўна, апраўданым», — падкрэсліў расійскі лідар. Ён адзначыў: інтэграцыя паглыблялася ў розных аспектах, у тым ліку ў сферах гарантавання бяспекі, эканомікі, ды і сувязі, якія захаваліся яшчэ з часоў СССР, адыгрываюць сваю станоўчую ролю.

Адна з тэм нефармальнай сустрэчы — агульная барацьба з пандэміяй каранавіруснай інфекцыі. «Нашы калегі супрацоўнічаюць вельмі канкрэтна, глыбока», — падкрэсліў Уладзімір Пуцін.

На сустрэчу лідараў дзяржаў запрасілі кіраўніка Федэральнай службы па наглядзе ў сферы аховы правоў спажыўцоў і дабрабыту чалавека — галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Расіі Ганну Папову. Лідары СНД, рэагуючы на яе выступленне, агучылі сваё бачанне сітуацыі і задалі спецыялісту пытанні.

Аляксандр Лукашэнка ў сваю чаргу адзначыў, што для кіраўнікоў дзяржаў важна разумець, як будзе развівацца сітуацыя з пандэміяй у будучыні. «Галоўнае пытанне для нас — пытанне прагнозу», — падкрэсліў беларускі Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы расказаў, што з першых месяцаў пандэміі патрабаваў ад сваіх спецыялістаў даць прагноз як па канкрэтным штаме каранавіруса, так і на будучыню. Былі кантакты на гэты конт і з расійскімі спецыялістамі, аднак у цэлым ніводзін прагноз у поўнай меры, у прыватнасці па тэрмінах, не апраўдаўся. «Можа, вы скажаце нам, што будзе заўтра? Учора ці сёння — «дэльта», заўтра — «амікрон». Паслязаўтра што будзе, на што нам арыентавацца?» — пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі ўдакладніў у галоўнага санітарнага ўрача Расіі, ці варта пасля «амікрону» чакаць новых штамаў каранавіруса і ці лягчэй «амікрон» за «дэльта»-штам?

«Ніводзін вірус не спыняецца ў сваім развіцці, і не варта чакаць, што «амікрон» стане фінальным варыянтам... Які будзе наступны, сёння сказаць нельга, але любы вірус жыве толькі тады, калі ён мяняецца», — растлумачыла Ганна Папова.

Як расказала галоўны санітарны ўрач, расійскія спецыялісты пабывалі ў ПАР, каб вывучыць «амікрон»-штам. Высветлілася, што ў гэтай краіне вірус не выклікае цяжкага цячэння хваробы, акрамя тых, хто не прышчэплены або мае спадарожныя захворванні. Аднак, растлумачыла Ганна Папова, магчыма, гэта з-за таго, што сярэдні ўзрост жыхароў ПАР да 30 гадоў, а маладыя людзі пераносяць захворванне лягчэй.

У цэлым жа пакуль спецыялісты не могуць сказаць, што пандэмія ідзе на спад, і рыхтуюцца супрацьдзейнічаць распаўсюджванню новага штама, абараняць людзей, падсумавала галоўны санітарны ўрач Расіі.

Далейшае абмеркаванне эпідэміялагічнай сітуацыі на прасторы СНД і іншых тэм, якія датычацца развіцця інтэграцыйных працэсаў, лідары Садружнасці працягнулі ўжо ў закрытым фармаце, адзначыла прэс-служба Прэзідэнта Беларусі.

## КОРАТКА

- **Беларусь і Індыя аб'яўляюць конкурс навукова-тэхнічных праектаў на 2022—2023 гады.**
- Вялікі калядны паказ мод пройдзе ў Нацыянальнай школе прыгажосці 29 снежня. Гэтым вечарам на подыуме прадставяць зімовыя і святочныя калекцыі вядомых беларускіх брэндаў, якія толькі набіраюць папулярнасць.
- **Уран, Нептун, Сатурн і прыгажуня Венера: у навагоднія святы можна ўбачыць парад планет. Па словах спецыялістаў, найлепшы час для назірання за парадам — 17.00.**

ISSN 1990 — 763X

Спажывец

# ПУХНАТЫЯ, ДУХМЯНЫЯ, ЭКАЛАГІЧНЫЯ

### Даведаліся аб «ёлачнай модзе — 21» і цэнах на жывыя ялінкі

**Ёлачныя кірмашы стартавалі ў Беларусі тыдзень таму: у Брэсце з 18 снежня, у сталіцы — з 22-га. А ў лясгасы па жывую ялінку людзі пачалі наведвацца яшчэ да адкрыцця навагодніх гандлёвых пляцовак. І сёлета значна часцей пакупнікі выбіраюць самы экалагічны варыянт навагодняй ёлкі — у кадцы.**

СТАР. 9




Набыць ялінку ў кадцы можна і на ёлачных кірмашах.

Тэма дня

# НОВАЯ СТРАТЭГІЯ ЛІЧБАВІЗАЦЫІ КРАІНЫ

#GBC

За 2021 год форумы #GBC ахапілі ўсю краіну і сталі новай дыялогавай пляцоўкай для абмеркавання развіцця і перспектыў лічбавай будучыні Беларусі

**Акрамя штодзённай работы над рэалізацыяй важных стратэгічных праектаў, глабальнай мэтай Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Нацыянальны цэнтр абмену трафікам» з'яўляецца ўкараненне сучасных інфармацыйных тэхналогій у сферы ўзаемадзеяння дзяржавы, бізнесу і грамадзян у Рэспубліцы Беларусь.**

**Яскравым прыкладам гэтага з'яўляецца правядзенне форумаў #GBC (Дзяржава. Бізнес. Грамадзяне).**

СТАР. 12

# «ХОЧАМ, КАБ КОЖНАЕ ДЗІЦЯ АДЧУЛА, ШТО Ў ЖЫЦЦІ ЁСЦЬ МЕСЦА ЦУДАМ»

**Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА падчас дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» наведаў дзіцячы дом сямейнага тыпу Маргарыты і Юрыя Галіноўскіх у Жодзіне.**



Прэм'ер адзначыў, што ў краіне спрыяльна складваецца сітуацыя з дзецьмі, якія з-за розных прычын засталіся без апекі бацькоў, адзначаецца высокая дынаміка закрыцця традыцыйных інтэрнатаў. «Кожны год павялічваецца колькасць дзяцей, якія пераязджаюць з дамоў-інтэрнатаў у больш сямейныя ўстановы, такія як дамы сямейнага тыпу. Напрыклад, толькі ў Жодзіне тры такія дамы. І той інтэрнат, які функцыянаваў раней, цяпер зачыніўся, таму што практычна ўсе дзеці раз'ехаліся па сем'ях, дзе яны могуць жыць ва ўмовах, набліжаных да сапраўдных сем'яў», — перадае словы прэм'ер-міністра БелТА.

Паводле Рамана Галоўчанкі, акцыя «Нашы дзеці» мае асаблівае значэнне: «Дзеці, якія трапілі ў складаную сітуацыю, маюць патрэбу ў асаблівай увазе. Мы хочам, каб дзякуючы акцыі «Нашы дзеці» кожнае дзіця адчула, што ў жыцці ёсць месца цудам».

Рамана Галоўчанку гаспадары запрасілі на чай, прэзентавалі наваградскую карціну, зробленую самастойна, а ён уручыў ім салодкія падарункі, камп'ютар і шматфункцыянальнае прыстасаванне для друку.

«Самае галоўнае — беражыце сваю вялікую сям'ю, паважайце бацькоў, дапамагайце ім ва ўсім, дапамагайце адно аднаму, будзьце дружнымі», — пажадаў прэм'ер дзецям.

Маргарыта і Юрый Галіноўскія з 2006 года працуюць бацькамі-выхавальнікамі. Цяпер у іх доме сямейнага тыпу жывуць сямёра прыёмных дзяцей. Сям'я мае добраўпарадкаваны двухпавярховы дом.

У час рабочай паездкі ў Жодзіна Раман Галоўчанка таксама наведаў Беларускі аўтамабільны завод і ўзяў удзел у вытворчай нарадзе.

# САПРАЎДНЫЯ ГЕРОІ ГЭТАГА ГОДА

## Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды і Падзякі Прэзідэнта Беларусі

**Узнагарод удастоены 57 прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці з усіх рэгіёнаў краіны — медыкі, настаўнікі, работнікі культуры, кіраўнікі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і творчых прафесій. 45 чалавек узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі». Восем чалавек атрымалі ордэн Францыска Скарыны. Акрамя таго, уручаны чатыры Падзякі Прэзідэнта.**



Фота БелТА.

**Ігар СЕРГЕЕНКА ўручае медаль «За працоўныя заслугі» галоўнаму ўрачу Магілёўскага Дома дзіцяці для дзяцей з парушэннямі цэнтральнай нервовай сістэмы і псіхікі Наталлі АЛЕКСАНДРОВІЧ.**

«Завяршаецца 2021 год. Краіна рыхтуецца прайсці чарговую мяжу леталічэння сваёй незалежнасці. Кожны год для нас важны як новая ступень у будаўніцтве маладой суверэннай дзяржавы. Адыходзячы год запомніўся перш за ўсё галоўнай палітычнай падзеяй у жыцці краіны. Мы правялі Усебеларускі народны сход, вызначылі прыярытэты развіцця Беларусі, разам выбралі дату і ўпершыню адзначылі новае дзяржаўнае свята — Дзень народнага адзінства», — падвёў асноўныя вынікі года Ігар Сергеенка. Паводле яго слоў, у новы год беларусы ўступаюць з аптымізмам і ўпэўненасцю ў заўтрашнім дні. «Гэтую ўпэўненасць даюць вы, працавітыя, адказныя людзі, якія заражаныя на вынік і без астатку аддаюць сябе сваёй справе», — падкрэсліў ён.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта акцэнтаваў увагу, што ў 2021 годзе былі захаваны самы высокі за апошнія 10 гадоў тэмп росту прамысловай вытворчасці, узмацняецца інавацыйная дзейнасць: на МТЗ выпушчаны першы беспілотны трактар, пачалося тэсціраванне доследных узораў новай айчыннай кар'ернай тэхнікі БелАЗ. Істотна вырас экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі, павялічылася геаграфія паставак, забяспечана станоўчае сальда знешняга гандлю. У 2021 годзе ўведзены ў эксплуатацыю шэраг важных аб'ектаў аховы здароўя па ўсёй краіне, спартыўныя комплексы ў Магілёве, у Брэсцкай і Віцебскай абласцях, пабудавана 40 тысяч кватэр. «Мы ўпэўнена падымаемся на высокія месцы ў міжнародных рэйтынгах па ўзроўні жыцця. Важна, што мы ідзём наперад, нягледзячы на пандэмію і беспрэцэдэнтны ціск з-за мяжы», — канстатаваў ён.

Ігар Сергеенка заўважыў, што ўсе гэтыя дасягненні ў розных сферах дзейнасці сталі магчымыя дзякуючы прафесіяналам сваёй справы, надзейным і адданым роднай зямлі людзям. «Вы сапраўдныя героі гэтага года, і, улічваючы выклікі нашага часу, гэта не метафара, а канстатацыя факта», — адзначыў ён.

Сярод узнагароджаных шмат медыкаў, якія ўжо другі год на перадавой змагаюцца з пандэміяй каранавіруса. Сярод іх — **прафесар кафедры інфекцыйных захворванняў і дзіцячых інфекцый Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Ганна КЛЮЧАРОВА**. Свой медаль «За працоўныя заслугі» яна назвала агульным са сваімі калегамі. «Калі казаць пра тое, як прайшоў год, ён быў цяжэйшы, але гэта быў проста працоўны год. Увесь час былі хворыя, вучоба. Мы пачыналі працаваць з ковідам два гады таму, калі мы нічога не ведалі. І тыя схемы лячэння, з якіх мы пачыналі, сышлі зусім і цяпер прыйшлі новыя схемы. Прыйшла вакцынацыя, і з'явілася надзея на тое, што перамога над хваробай павінна адбыцца», — адзначыла яна.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

---

Ведаць галоўнае

**Уладзімір КУХАРАЎ:**

# «Інфармацыю трэба чэрпаць з розных крыніц»

**Любімы від спорту мэра сталіцы — футбол, а самы яскравы ўспамін з яго студэнцкага жыцця звязаны з выездам на першым курсе разам з аднакурснікамі на бульбу. Пра гэта старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў расказаў падчас анлайн-сустрэчы са студэнтамі сталічных ВНУ.**

**М-стрым — Мінскі маладзёжны стрым — новы фармат стасункаў Мінгарвыканкама і сталічнай моладзі.** Мяркуецца, што такія сустрэчы стануць рэгулярнымі. І першы блін не выйшаў камяком. У М-стрыме ўзялі ўдзел студэнты дзевяці сталічных ВНУ — Універсітэта грамадзянскай абароны МНС Беларусі, Інстытута пагранічнай службы, Акадэміі МУС, Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта і Міжнароднага ўніверсітэта МІТСО. Маладых людзей цікавілі як перспектывы азелянення горада, развіцця спартыўнай інфраструктуры, актуальныя для сталічнага рынку спецыяльнасці і важныя для паспяховай пабудовы кар'еры прафесійныя якасці, так і пытанні, якія датычацца міграцыйнага крызісу і будучага рэферэндуму.

Адказваючы на пытанне курсанта Універсітэта грамадзянскай абароны МНС аб новай рэдакцыі чацвёртага раздзела Канстытуцыі і замацавання статусу Усебеларускага народнага сходу ў ім, старшыня Мінгарвыканкама падкрэсліў важную ролю гэтага прадстаўнічага органа, які вырашае актуальныя пытанні развіцця дзяржавы. «Яго ўдзельнікі — вопытныя, кампетэнтныя спецыялісты, якія добра ведаюць сітуацыю ў краіне. Сёння вельмі важная кансалідацыя народа, а замацаванне статусу Усебеларускага народнага сходу ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дапамога ўсіх згуртаваць», — падзяліўся Уладзімір Кухараў сваім меркаваннем.

Студэнтаў цікавіла таксама, якім СМІ аддае перавагу мэр Мінска.

«Лічу, што трэба чэрпаць інфармацыю з розных крыніц, таму я штодня праглядаю розныя віды сродкаў масавай інфармацыі. Гэта дазваляе адчуваць і нават прадбачыць праблемныя сітуацыі, заўсёды быць у курсе таго, што адбываецца, — канстатаваў старшыня Мінгарвыканкама. — Імкнуся, наколькі дазваляе час, чытаць газеты і інтэрнэт-рэсурсы. Рэгулярна праглядаю навіны і з тэлеграм-каналаў. Часам абмяркоўваем нейкія прачытаныя матэрыялы. Калі ёсць праблемныя пытанні, імкнёмся іх аператыўна вырашыць».

Акрамя таго, кіраўнік адміністрацыі горада адзначыў, што праз СМІ Мінгарвыканкам забяспечвае зваротную сувязь з гараджанамі, інфармуючы аб тэндэнцыях развіцця горада, яго жыцця і не толькі...

Студэнтка Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта пацікавілася ў мэра, ці плануецца будаўніцтва ў Студэнцкай вёсцы, дзе пражывае сёння 7,5 тысячы студэнтаў, новых сацыяльных і спартыўных аб'ектаў?

«А што хочуць, каб там было, самі студэнты? — пытаннем на пытанне адказаў Уладзімір Кухараў. — Мяркую, што моладзь павінна ініцыяваць і ўносіць свае прапановы. Што яшчэ трэба зрабіць, каб палепшыць умовы для пражывання, самаразвіцця і актыўнага адпачынку ў Студэнцкай вёсцы? Мы гатовы вас выслухаць. Калі ёсць ідэі, заўсёды адгукаемся на іх. Так, напрыклад, на стадыёне «Трактар» па ініцыятыве Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі з'явіцца маладзёжная пляцоўка. У наступным годзе прапануем усім студэнтам узяць удзел у рэканструкцыі гэтага аб'екта. Плануецца, што яшчэ адна зона для моладзі — крытая пляцоўка для экстрэмальных відаў спорту — будзе пабудавана каля «Мінск-Арэны».

Адказваючы на пытанне студэнткі БДТУ аб планах па азеляненні сталіцы, Уладзімір Кухараў расказаў, што зімой у парку Уга Чавеса пачнуць фарміраваць кроны высаджаных дрэў. У будучыні ў парку з'явяцца пешаходныя дарожкі, месцы адпачынку, дзіцячая пляцоўка. Маштабная рэканструкцыя працягваецца і ў парку імя Паўлава. Акрамя таго, у горадзе з'явіцца некалькі новых алей. Старшыня Мінгарвыканкама запрасіў будучых «зялёных дызайнераў» да ўдзелу ў распрацоўцы праектаў па азеляненні і кветкавым афармленні праспекта, вуліц і паркаў сталіцы.

Уладзімір Кухараў адзначыў, што ўмовы надвор'я сёлета дазваляюць займацца зімовымі відамі спорту: у сталіцы заліта ўжо 50 каткоў, з дапамогай снежных пушак створана лыжная траса ў Вяснянцы. «Будзем ствараць такія ж трасы і ў іншых раёнах сталіцы», — паабяцаў моладзі старшыня Мінгарвыканкама.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

---

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## The Telegraph: Вялікабрытанію чакае эканамічная фіяска часоў крызісу 2008 года

Вялікабрытанію чакае пагаршэнне эканамічнай сітуацыі з-за цэн на газ, падобнае таму, што адбылося падчас фінансавага крызісу 2008 года. Пра гэта гаворыцца ў публікацыі брытанскай газеты The Telegraph, якая правяла апытанне сярод топ-менеджараў энергетычных кампаній і ўрадавых чыноўнікаў, паведамляе РІА Навіны.

У прыватнасці, The Telegraph прыводзіць словы Стэфана Фіцпатрыка, кіраўніка OVO Energy, другога па аб'ёмах энергетычнага пастаўшчыка ў каралеўстве. Ён параўнаў бягучы стан спраў з перыядам паміж крахам банка Northern Rock і калапсам фірмы Lehman Brothers праз год. Топ-менеджар прадказаў рынку брытанскай энергетычны фіяска. На яго думку, заканчэнне крызісу настане няхутка. Стэфан Фіцпатрык таксама абвінаваціў улады краіны ў занадта марудным пошуку падыходзячых рашэнняў для выхаду з тупіку.

Урад Вялікабрытаніі заявіў, што знаходзіцца ў пастаянным кантакце з прадстаўнікамі індустрыі, і паабяцаў абараніць спажыўцоў ад росту цэн, гаворыцца ў публікацыі.

## Узброеныя Сілы Украіны папрасілі палітыкаў не піярыцца на абароне

Ва Узброеных Сілах Украіны заклікалі палітыкаў не ўмешвацца ў арганізацыю абароны краіны, за выключэннем тых месцаў, якія вызначаны законам. Такую заяву зрабіў міністр абароны краіны Аляксей Рэзнікаў, паведамляецца на сайце ведамства.

«Я заклікаю вас (палітыкаў. — **Рэд.**) устрымацца ад дзеянняў і выказванняў, якія палітызуюць справу арганізацыі тэрытарыяльнай абароны. Гаворка ідзе аб найважнейшым — абароне нашай краіны. Тут не месца піяру і перакручванням. Мы ўсе разам павінны працаваць дзеля інтарэсаў Украіны, кожны — у межах сваіх паўнамоцтваў», — адзначыў Рэзнікаў.

## Над востравам Пальма сфатаграфавалі незвычайна доўгі хвост каметы



Яшчэ два тыдні таму на востраве Пальма ў Іспаніі вывяргаўся вулкан Кумбрэ-В'еха, і фотарэпарцёры спяшаліся захаваць на будучае выявы беспрэцэдэнтных гор попелу, якія засыпалі мясцовыя гарады і пасёлкі. Цяпер жа, калі вывяржэнне скончылася, іх увагу прыцягвае іншы аб'ект.

Фатограф з Германіі Себасцьян Вольтмер раптам выявіў, што на часткова апусцелай Пальме з-за адсутнасці светлавога шуму вельмі добра відаць камету Леанарда, якая ў сярэдзіне снежня абмінула найбліжэйшы да Зямлі пункт сваёй арбіты і цяпер накіроўваецца ў бок Сонца.

На здымку, зробленым 26 снежня, ён на доўгай вытрымцы сфатаграфаваў неверагодна доўгі газавы хвост C/2021 A1. Такое відовішча — вынік так званага раз'яднання хваста каметы. Механізм гэтай з'явы вывучаны не да канца, аднак вучоныя лічаць, што важную ролю ў «расцягванні» газаў хваста і іх аддаленні ад каметы іграе сонечны вецер падчас высокай сонечнай актыўнасці.

# «УДАСКАНАЛЕННЕ АСНОЎНАГА ЗАКОНА КРАІНЫ — ГЭТА ШЛЯХ ДА АДЗІНСТВА»

**Апублікаваны праект змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь для ўсенароднага абмеркавання — у топе навін апошніх дзён (можна меркаваць аб тым і па нашым сайце, дзе поўны тэкст прапанаванага дакумента на беларускай мове трымаецца ў лідарах па праглядах). Пасля чытання, як і павінна быць, прыйдзе асэнсаванне і жаданне падзяліцца сваім меркаваннем. Пачутыя будуць усе: на розных дыялогавых пляцоўках, падчас грамадскіх прыёмаў, нават у рэжыме анлайн. Балазе досвед ёсць: менавіта ў фармаце абмеркавання збіраліся прапановы і ва ўжо апублікаваны праект. Нездарма ж наш Асноўны Закон пачынаецца са слоў: «Мы, народ Беларусі...»**

**«Звязда» на сваіх старонках таксама адкрывае сваю дыялогавую пляцоўку. У пастаяннай новай рубрыцы «Канстытуцыя: у фармаце абмеркавання» мы будзем публікаваць думкі і аналітыку ад экспертаў, тлумачыць новыя моманты. Калі ў вас з'явяцца меркаванні з нагоды — пішыце ў рэдакцыю або наўпрост у арганізацыю, якая будзе акумуляваць і аналізаваць усе заўвагі і прапановы, — Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі. Можна скарыстацца электроннай поштай sbor@ncpi.gov.by; можна запоўніць электронную форму, якая маецца на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале па адрасе https://sbor.pravo.by; можна даслаць па пошце на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Берсана, 1а, НЦПІ, з пазнакай «Канстытуцыя».**

**Ігар ГЕДЗІЧ, член Савета Рэспублікі, каардынатар гуманітарнай місіі ў крызісным лагеры бежанцаў на беларуска-польскай граніцы:**

— Назіраючы за бежанцамі ў ТЛЦ «Брузгі», я злавіў сябе на думцы, што гэтыя людзі страцілі ўсё: сям'ю, прытулак, дзяржаўнасць... Ім няма пра што клапаціцца. Нам жа ёсць што губляць. І, як любая сям'я, у якой з'яўляюцца дзеці і ўнукі, развіваецца, так і наша дзяржава не можа стаяць на месцы. Той факт, што пытанне ўнясення змяненняў у Канстытуцыю выносіцца на рэферэндум, ужо з'яўляецца прыкметай дэмакратычнага развіцця і паступальнага руху наперад. Прэзідэнт заўсёды казаў, што нам не патрэбны рэвалюцыі. А эвалюцыйны шлях развіцця — гэта якраз рэферэндум, які плануецца правесці па Канстытуцыі. Дарэчы, рэферэндум стане чацвёртым. І гэта толькі за найноўшую гісторыю нашай дзяржаўнасці!

Хацеў бы адзначыць пасіянарнасць нашага Прэзідэнта. Пасіянарыі — не толькі тыя, хто валодае значнай энергіяй, але і тыя, хто ператтварае энергію ва ўчынкі. Яшчэ ў 2020 годзе Аляксандр Лукашэнка казаў, што будзе рэферэндум па змене Канстытуцыі.

Як бачым, словы не разыходзяцца са справай. А гэта прыкмета не толькі сучаснага палітыка, але і сапраўднага мужчыны. Узяць, напрыклад, усё тую ж праблему бежанцаў. Як ярка еўрапейскія палітыкі кажуць! Але пры гэтым нічога не робяць. Або частка нашых збеглых палітыкаў, якія проста спрабуюць раз'яднаць наш народ. Праграма, якую яны прапаноўвалі, — гэта ж адкат у мінулае. Да таго ж напахвае нацыяналізмам у горшай яго праяве. Або іх ідэі аб падтрымцы ЛГБТ-супольнасцяў. У нашай краіне гэтага ніколі не будзе, таму што нашы асновы грунтуюцца на класічнай мадэлі саюза мужчыны і жанчыны. Збеглыя палітыкі хацелі, каб Беларусь выйшла з саюзнай дзяржавы і АДКБ. Па сутнасці, гэта развал краіны і тых памкненняў, якія заўсёды існавалі ў нашым грамадстве, і дзясяткаў гадоў нашай працы. Іх праграма, як вы ведаеце, павісела ў сетцы некалькі дзён, а потым яе спешна прыбралі. Гэта сведчыць аб тым, што нічога істотнага прапанаваць яны не могуць. А значыць, іх месца на звалцы гісторыі.

Удасканаленне Асноўнага Закона краіны — шлях да адзінства, які мы павінны прайсці з гонарам. Гэта значыць, кожны павінен выказаць сваё меркаванне. Не праз бойкі ў парламенце, не праз напружанасць у грамадстве, а праз дыялог як з тымі, хто падтрымлівае Прэзідэнта, так і з тымі, хто мае іншае меркаванне. Бо была праведзена велізарная праца: атрымана некалькі соцень прапаноў па змене Канстытуцыі. І гэта чарговы крок да абароны нашага суверэнітэту, самаідэнтычнасці, поглядаў на жыццё і настаўленняў, якія нам пакінулі дзяды. У гэтым я бачу сэнс удасканалення Канстытуцыі, а таксама існавання нашай дзяржавы.

**Таццяна РУНЕЦ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, член Канстытуцыйнай камісіі:**

— Канстытуцыя любой краіны — не догма і нейкі архаічны дакумент. З развіццём дзяржавы і грамадства Асноўны Закон краіны павінен трансфармавацца і відазмяняцца, зыходзячы з патрэб насельніцтва, сучасных рэалій жыцця, выклікаў і пагроз, якія ўзнікаюць перад дзяржавай. Пераканана, што ўдасканаленне Асноўнага Закона — гарантыя будучыні любой дзяржавы.



Фота БелТА.

Апублікаваны праект абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь якраз і накіраваны на замацаванне асноватворных аспектаў развіцця сучаснага беларускага грамадства, захаванне і замацаванне пераемнасці гістарычнага вопыту, удасканаленне механізмаў дзяржаўнага кіравання, аптымізацыю яго функцый.

Хачу звярнуць увагу на навацыі: новы інстытут — Усебеларускі народны сход, з'яўленне якога стане яшчэ адным інструментам на шляху ўмацавання народаўладдзя ў краіне; аднасесійны перыяд дзейнасці абедзвюх палат парламента; адзіны дзень галасавання за народных выбраннікаў усіх узроўняў; іх пяцігадовы выбарны перыяд і многае іншае.

Акрамя таго, у цэнтры ўвагі застаецца галоўнае адрозненне палітычнага курсу краіны — яго сацыяльная арыентаванасць, замацаванне на канстытуцыйным узроўні асноўных прыярытэтаў дзяржавы: такіх як падтрымка сем'яў з дзецьмі, сірот, інвалідаў і забеспячэнне роўных магчымасцяў апошнім у рэалізацыі іх правоў і свабод.

Дарэчы, многія прапановы, якія знайшлі адлюстраванне ў праекце Канстытуцыі, былі ініцыіраваны членамі Савета Рэспублікі. Разам з тым яшчэ чакае сур'ёзная работа па дапрацоўцы канчатковага варыянта Асноўнага Закона, які будзе вынесены на ўсенародны рэферэндум у сярэдзіне лютага. Паўдзельнічаць у гэтым працэсе можа кожны грамадзянін нашай краіны, хто выкажа свае прапановы па ўдасканаленні галоўнага дакумента краіны. Ад нас жа, парламентарыяў, спатрэбіцца наступнае заканадаўчае напаўненне па прыняцці новых і карэкціроўцы значнай колькасці дзеючых нарматыўных актаў — стварэнню прававых механізмаў укаранення канстытуцыйных навацый.

**Ірына ДАЎГАЛА, член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

— Зрабіць крок — і дарога з'явіцца сама сабой. І гэты крок сапраўды быў зроблены беларусамі для абнаўлення Канстытуцыі. Усяму свой час. І гэты час прыйшоў. Унутрыпалітычная абстаноўка, якая складваецца, і асаблівасці знешняй абстаноўкі — усё гэта дыктавала неабходнасць унясення змяненняў у Асноўны Закон краіны. Кожнае слова, кожны радок, кожны артыкул Канстытуцыі мае сваё каласальнае значэнне. На сустрэчах, дыялогавых пляцоўках, дыскусіях абмяркоўваліся пытанні наспелай неабходнасці абнаўлення галоўнага дакумента краіны. Прафесійны склад Канстытуцыйнай камісіі ўзважваў кожную прапанову, прычым з улікам аналізу ўсіх пытанняў, статыстычных і сацыялагічных даследаванняў, усебаковага аналізу ўсіх навел, якія прапаноўваліся. І вось абноўленая Канстытуцыя апублікавана для ўсенароднага абмеркавання. Азнаёміцца са змяненнямі, якія прапаноўваюцца, і выказаць свой пункт гледжання будзе цікава грамадзянам, якія валодаюць выбарчым правам. Вывучаем і абмяркоўваем разам!

**Вольга ЧАМАДАНАВА, начальнік Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама:**

— Прынцыпы новай Канстытуцыі — стратэгічны крок у далейшым развіцці нашай краіны. Яе новая рэдакцыя — унікальная магчымасць будаваць сваю будучыню ў суверэннай незалежнай дзяржаве. Асноўны Закон краіны з'яўляецца яшчэ адным падмуркам, які мы закладваем для таго, каб будаваць свой заўтрашні дзень. Прыняць удзел у рэферэндуме — абавязак кожнага грамадзяніна. Людзі павінны прыйсці і прагаласаваць за новую рэдакцыю закона, які мы сёння маем магчымасць абмяркоўваць. Мы не павінны гэтага баяцца. Трэба быць упэўненымі ў заўтрашнім дні. А для гэтага ўсё ў нашай краіне ёсць. Канстытуцыя — чарговы крок для таго, каб стратэгічна наша краіна магла развівацца далей.

**Вікторыя ЛАДУЦЬКА, старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў, лідар раённай арганізацыі ГА «Беларускі саюз жанчын»:**

— У Канстытуцыі пасля ўсенароднага галасавання прапануецца замацаваць паняцце шлюбу як «саюза мужчыны і жанчыны». Улічваючы, як мяняецца паняцце сям'і ў сучасным свеце, лічу, што гэтая важная норма нашага жыцця варта асаблівай увагі і нават абароны. Сёння мы бачым, што адбываецца вакол Беларусі. У некаторых еўрапейскіх краінах назіраецца імклівы заняпад інстытута шлюбу і сям'і. Паглядзіце, як у свеце спрабуюць агрэсіўна навязаць «дэмакратычныя каштоўнасці», калі традыцыйныя каштоўнасці, інстытут сям'і як саюз мужчыны і жанчыны маскіруюцца пад волю асабістага выбару. У шэрагу краін у прававое поле ўведзены іншыя формы сям'і. Напрыклад, у Канстытуцыі Ірландыі гаворыцца, што шлюб могуць заключыць дзве асобы любога полу. Не мае дакладнай фармулёўкі аб шлюбе Асноўны Закон Італіі. У 2016 годзе ў гэтай краіне ўступіў у сілу закон аб аднаполых грамадзянскіх саюзах. Ён прадугледжвае для такіх пар большасць шлюбна-сямейных правоў, за выключэннем усынаўлення дзяцей. У 2015 годзе Вярхоўны суд ЗША перавагай усяго толькі ў адзін голас узаконіў аднаполыя шлюбы па ўсёй краіне. Не трэба на іх раўняцца, у нас свае векавыя каштоўнасці. Таму прапанаванае змяненне ў Асноўны Закон нашай краіны, які датычыцца замацавання паняцця шлюбу як «саюза мужчыны і жанчыны», лічу абсалютна апраўданым. І калі хтосьці захоча падвергнуць сумневу пастулаты, на якіх заснаваны інстытут сям'і, гэтая норма будзе ў Канстытуцыі. Наша нацыя такая, што аднаполыя сувязі ў беларускі менталітэт ніяк не ўпісваюцца. Лічу, што традыцыйныя сямейныя каштоўнасці павінны прапагандавацца на ўсіх узроўнях. Упэўнена, што асабліва важнае ў сямейным саюзе і разуменне ролі маці і бацькі, якое ўплывае ў тым ліку і на выхаванне дзяцей.

**Ігар ПЯТРОВІЧ, старшыня Уздзенскага раённага Савета дэпутатаў:**

— Канстытуцыя ў нас сацыяльна накіраваная на падтрымку чалавека, павышэнне ўзроўню жыцця, мір, бяспеку, спакой і стабільнасць у дзяржаве. Асабліва радуе мяне як бацьку, што ў праекце асаблівая ўвага ўдзелена сям'і ў традыцыйным яе разуменні, шлюбу паміж жанчынай і мужчынам. Сям'я — аснова грамадства, дзе закладваюцца маральныя каштоўнасці, перадаецца ўсё найлепшае ад пакалення да пакалення, а дзеці выхоўваюцца ў найлепшых сямейных традыцыях, дзе для іх прыкладам з'яўляюцца бацькі, дзядулі і бабулі. Менавіта добрае выхаванне дапамагае справіцца з такімі праблемамі, як наркаманія, алкагалізм, злачыннасць. Мне імпануе, што дзяржава бярэ і надалей пад свой патранаж мацярынства, дзяцінства.

На маю думку, важна і тое, што выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і мясцовых Саветаў дэпутатаў будуць праводзіцца ў адзіны дзень галасавання. Гэта будзе садзейнічаць скарачэнню фінансавых і арганізацыйных выдаткаў на правядзенне выбараў, створыць дадатковыя зручнасці для выбаршчыкаў і ўмовы для работы выбарчых камісій, дазволіць якасна да іх падрыхтавацца.

**Юлія АРЦЮХ, вядучая СТБ, грамадскі дзеяч:**

— Рэферэндум па папраўках у Канстытуцыю — гэта новы віток у гісторыі суверэннай Беларусі. Канстытуцыя — падмурак, на якім грунтуюцца іншыя законы краіны, і чым больш трывалы гэты падмурак, тым больш моцным і ўпэўненым будзе наша грамадства.

Грамадзянская пазіцыя тады актыўная, калі выбудавана не толькі на прынцыпах спажывання, але і на аддачы і адказнасці. І гэта якраз з'яўляецца адным з асноўных момантаў.

Унесеныя папраўкі сапраўды вельмі актуальныя. Яны прадыктаваны часам і падзеямі ў краіне, накіраваны на ўмацаванне і абарону нашага беларускага народа, у тым ліку ад пранікнення заходняй дэмакратыі, пабудаванай на чужых нам прынцыпах і ідэях. Можна лічыць, што новай Канстытуцыяй мы абяззброім калектыўны Захад у той гібрыднай вайне, якую ён праводзіць супраць нас.

Упэўненасць у шчаслівай будучыні, у здароўі ва ўсіх адносінах грамадстве для нашых дзяцей — вось што будзе вырашацца на рэферэндуме. Важнасць падзеі разумеюць, безумоўна, усе беларусы.

**Меркаванні запісалі Вольга АНУФРЫЕВА, Вераніка КАНЮТА, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Урачыстасць

# Дасягненням — высокая ацэнка

Звыш 600 супрацоўнікаў цэнтральнага апарату МУС, ГУУС сталіцы і УУС Мінскай вобласці атрымалі медалі «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку»



«Уручаныя ўзнагароды — гэта высокая ацэнка, якую кіраўнік дзяржавы даў працы і прафесіяналізму праваахоўнікаў, — адзначыў **міністр унутраных спраў генерал-лейтэнант міліцыі Іван КУБРАКОЎ.** — Заслуга належыць не толькі ім: за гэтым поспехам стаяць праца калектываў і вялізная падтрымка родных. Напярэдадні новага года выказваю праваахоўнікам падзяку за працу ў адыходзячым 2021-м і жадаю шчасця, здароўя і поспехаў».

Кіраўнік міліцэйскага ведамства таксама падкрэсліў, што абстаноўка ў краіне застаецца спакойнай. «У навагоднюю ноч, калі большасць беларусаў сядуць за святочныя сталы, міліцыянеры застануцца на сваіх пастах, каб і далей забяспечваць іх бяспеку», — сказаў Іван Кубракоў.

Як падзяліўся **намеснік начальніка Акадэміі МУС палкоўнік міліцыі Аляксей БАШАН,** такая ўзнагарода значная для кожнага міліцыянера. «Наша ўстанова адукацыі рыхтуе спецыялістаў для шматлікіх праваахоўных органаў, — заўважыў прадстаўнік ВНУ. — Самая галоўная якасць, якую мы хочам бачыць у курсантах, — неабыякавасць. Мы можам навучыць іх усяму, акрамя неабыякавасці. Чэрстваму чалавеку ў міліцыі няма чаго рабіць. Вартавы парадку не можа прайсці міма несправядлівасці, не ўключыцца ў барацьбу дабрыні са злом. Ён павінен быць гатовы ахвяраваць дзеля навакольных часам, здароўем і, калі спатрэбіцца, нават жыццём».

Кампетэнтна

Палкоўнік міліцыі Юрый КУЛЕШ:

# «АД ХУТКАСЦІ ПРЫНЯЦЦЯ РАШЭННЯ НЯРЭДКА ЗАЛЕЖЫЦЬ ЖЫЦЦЁ»

**Начальнік упраўлення аператыўна-дзяжурнай службы міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў — аб асноўных тэндэнцыях у развіцці аператыўна-дзяжурнай службы і асаблівасцях яе функцыянавання ў сучасных умовах.**

***— Юрый Мікалаевіч, сёлета падраздзяленне упершыню святкавала свой дзень нараджэння замест 12 ліпеня, як гэта было заўсёды, 18 лістапада. Больш за тое, свой летапіс яно пачало весці значна раней...***

— Днём утварэння дзяжурнай службы органаў унутраных спраў доўгі час лічылася 12 ліпеня: у 1966 годзе ў гэты дзень у якасці самастойнага падраздзялення ў структуры МУС была створана дзяжурная часць. Аднак дзякуючы рабоце ў архівах высветлілася цікавая дэталь. Адзін з дакументаў сведчыць, што 18 лістапада 1920 года загадам Народнага камісарыята ўнутраных спраў СССР № 17 быў прызначаны дзяжурны па камісарыяце. У загадзе былі прапісаны яго асноўныя абавязкі, якія сёння абсалютна ідэнтычныя тым задачам, якія выконваюць супрацоўнікі аператыўна-дзяжурнай службы. Згодна з загадам міністра ўнутраных спраў, дзень утварэння дзяжурнай службы органаў унутраных спраў будзе адзначацца 18 лістапада. Налета ёй споўніцца 102 гады!

***— Вядома, з таго часу шмат што памянялася. Якімі навацыямі сёння можна ганарыцца?***

— Тэатр пачынаецца з вешалкі, а міліцыя — з аператыўна-дзяжурнай службы. Гэта асноўны орган упраўлення ўсімі нарадамі, задзейнічанымі ў адзінай дыслакацыі. Сучасныя сродкі навігацыі — інтэрактыўныя GPS-карты, радыёстанцыі і іншае абсталяванне — дазваляюць нам кантраляваць месца знаходжання нарадаў, а адпаведна рэагаваць на паведамленні грамадзян больш аператыўна. Працэс узаемаадносін супрацоўнікаў міліцыі з грамадзянамі, а таксама працэс затрымання правапарушальнікаў фіксуецца на аўдыя- і відэасродкі. Дзякуючы гэтаму спрэчныя, канфліктныя сітуацыі, якія ў нашай службе нярэдкія, вырашаюцца цяпер значна прасцей. Зразумела, час не стаіць на месцы, таму мы пастаянна імкнёмся развівацца, і гэта ў першую чаргу датычыцца абсталявання.



У прыватнасці, у дзяжурных аўтамабілі двух сталічных РУУС мы ўстанавілі сістэму відэаназірання, якая функцыянуе адразу ў аўтамабілі. Ідзе назіранне за адсекам для затрыманых: у нас з'явілася магчымасць сачыць за тым, каб пры перамяшчэнні з людзьмі нічога не адбылося.

***— Нават у такіх сітуацыях супрацоўнікі міліцыі клапоцяцца аб грамадзянах, нягледзячы на іх статус...***

— Наша галоўная мэта — дапамагчы людзям, а не прыцягнуць іх да адміністрацыйнай або крымінальнай адказнасці. Напрыклад, калі ўдзельнікі дарожна-транспартнага здарэння вырашылі не выклікаць ДАІ, а раз'ехацца па еўрапратаколе, мы не будзем рэагаваць на ДТЗ і шукаць вінаватых. І ў сітуацыі, калі аўтамабіль грамадзяніна перашкаджае праезду (пры ўмове, што прыпаркаваны ён па правілах дарожнага руху) іншага транспартнага сродку, мы не паедзем на месца, каб прымяніць да кагосьці санкцыйныя меры. Патэлефануем аўтаўладальніку і ветліва папросім адагнаць аўтамабіль. І такіх прыкладаў шмат.

***— Праца ў аператыўна-дзяжурнай службе вельмі напружаная і ўважлівая. Ад кампетэнтнай ацэнкі сітуацыі супрацоўнікамі міліцыі часта залежыць многае. Напэўна, не кожны, хто носіць пагоны, здольны працаваць у «дзяжурцы»?***

— Згодна з нашымі нарматыўнымі дакументамі, як правіла, у аператыўна-дзяжурную службу мы прымаем супрацоўнікаў, якія маюць ужо практычны вопыт службы ў органах унутраных спраў не менш чым два гады. Каб кіраваць нарадам на пэўнай тэрыторыі, патрэбна добра арыентавацца ў мясцовасці. На гэтыя пасады ў асноўным прызначаюцца супрацоўнікі, якія маюць вышэйшую юрыдычную адукацыю. Асабліва гэта датычыцца старшага аператыўнага дзяжурнага, старшага інспектара дзяжурнага. У іншых выпадках ёсць магчымасць прызначыць на дадзеную службу супрацоўніка, які мае іншую вышэйшую адукацыю, аднак па сваіх маральна-дзелавых якасцях здольны забяспечыць дарučаны ўчастак работы. І гэта звязана з тым, што дзяжурны павінен даць правільную кваліфікацыю падзеі, здарэнню, правапарушэнню і злачынству, у адпаведнасці з чым правільна сфарміраваць нарад, які паедзе рэагаваць. Гэта трэба зрабіць аператыўна і якасна. Ад хуткасці прыняцця рашэння дзяжурным, ад часу, на працягу якога прыедзе нарад, нярэдка залежыць і чалавечае жыццё.

***— Ці палегчыла работу практыка судовых працэсаў у рэжыме «анлайн»?***

— Пандэмія нас у многім абмяжоўвае. Але ў той жа час уключаюцца іншыя магчымасці: чалавек пачынае думаць, як у гэтых умовах забяспечыць функцыянаванне той ці іншай сістэмы. Шляхам відэаканферэнцыі мы можам разглядаць справы нашых правапарушальнікаў без дастаўкі іх у залу суда, што эканоміць не толькі час, але і сродкі. Пандэмія, а можа, і час падштурхнулі нас да такой формы ўзаемадзеяння з судовымі органамі. Гэта вельмі добры вопыт.

Патрыёты

# ГОДНАЯ ЗМЕНА

## Карэспандэнты «Звязды» наведалі ваенна-патрыятычны лагер «Граніт»

**На тэрыторыі вайсковай часці № 5448 унутраных войскаў Міністэрства ўнутраных спраў апошнім часам надзвычай шматлюдна. Два разы на тыдзень пасля ўрокаў, а таксама па суботах сюды спяшаюцца школьнікі — выхаванцы дзіцячага ваенна-патрыятычнага клуба «Граніт». Нягледзячы на тое, што клуб існуе ўсяго месяц, яго папулярнасць сярод навучэнцаў вялікая. І з гэтым складана паспрачацца, асабліва калі ведаеш, што наведваюць «Граніт» не толькі навучэнцы найбліжэйшых школ. Наўмысна едуць сюды і маленькія жыхары іншых раёнаў сталіцы.**

### ПРЫЙШЛІ НА «РАЗВЕДКУ» — І ЗАСТАЛІСЯ

Браты Даніл і Глеб Труханы жывуць у Фрунзенскім раёне. Да Ленінскага, дзе знаходзіцца вайсковая часць, — адлегласць немалая. Адпаведна, гэта дадатковы час на дарогу (добра, што бацька на машыне возіць). Аднак гэтыя нюансы хлопцаў абсалютна не цікавяць: яны з нецярпеннем чакаюць тых дзён, калі працуе клуб.

— Наш бацька раней служыў у спецназе, шмат расказвае пра той час, — гаворыць Даніл. — І калі мы даведаліся, што адкрываецца такі клуб, які знаходзіцца на базе аднаго з падраздзяленняў унутраных войскаў, мы вельмі захацелі трапіць у яго шэрагі. Тым больш мы ведалі, што займацца з намі будуць афіцэры, прапаршчыкі і сяржанты вайсковай часці.

Ваня Антоненка, аднакласнік Глеба, у дзень нашага візіту ў лагер прыехаў упершыню. Калі Глеб дзяліўся ўражаннямі ад наведвання «Граніта», а таксама відэазапісамі заняткаў, у клуб захацела трапіць ледзь не паўкласа. Ваня ад слоў перайшоў да справы. Пакуль сямігадовы хлопчык знаёміцца з абстаноўкай, уваходзіць, як кажуць, у курс справы. Школьніку падабаецца, а значыць, ён сюды прыедзе яшчэ.

На «разведку» са сваім сынам Аляксандрам прыйшла ў ваенна-патрыятычны клуб і Марыя Вішчэня. Пра «Граніт» даведаліся ад сваякоў. Пакуль яны назіраюць за працэсам, які адбываецца ў розных секцыях, хлопчык марыць паспрабаваць свае сілы ў барацьбе.

— Я вельмі хачу, каб сын займаўся, акрамя школы, дзесьці яшчэ, — прызнаецца жанчына. — Заняткі рознымі відамі спорту, а таксама мерапрыемствы патрыятычнай скіраванасці — выдатная альтэрнатыва гаджэтам. Я сама вырасла ў сям'і міліцыянера, таму добра ведаю, наколькі гэта важна цяпер, калі ў хлопчыку закладваецца мужчынскі характар. Пакаленне няпростае: каб дзеці не нарабілі глупстваў, трэба іх займаць карыснымі справамі. Шкада, што ў мой час такіх ваенна-патрыятычных клубаў не было.

### ГАЛОЎНАЕ — ЖАДАННЕ

Па буднях у «Граніце» — спартыўныя дні. Па групах дзеці займаюцца ў чатырох секцыях: стральба з пнеўматычнай зброі, фехтаванне з элементамі агульнафізічнай падрыхтоўкі, бокс і барацьба. Заняткі ў секцыях, якія тут называюць патрыятычным мнагаборствам, праводзяцца такім чынам, каб кожны раз дзеці паспрабавалі свае сілы ў новым відзе дзейнасці.

Па суботах выхаванцы ваенна-патрыятычнага клуба займаюцца ў межах дапрызыўнай падрыхтоўкі. Акрамя таго, праводзяцца мерапрыемствы грамадзянска-патрыятычнага выхавання: школьнікі наведваюць музеі і мемарыяльныя комплексы, дапамагаюць ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, прыбіраюць воінскія пахаванні.

На цяперашні момант клуб наведвае больш чым 70 чалавек. Аднак ахвотных яшчэ больш, таму ў найбліжэйшы час шэрагі «Граніта» папоўняць больш чым сто юных патрыётаў. Самым маленькім удзельнікам — сем гадоў, старэйшыя вучацца ў 11 класе. Каб трапіць у клуб, ад дзяцей неабходна

Профі

# «ХУТКАЯ ДАПАМОГА» Ў ПАГОНАХ

## З якімі паведамленнямі кожны дзень сутыкаецца міліцэйская «дзяжурка», на якія звароты рэагуе найбольш аператыўна і як вызначае несумленных інфарматараў?

**Аператыўна-дзяжурная служба — сэрца кожнага органа ўнутраных спраў, працуе без перапынкаў і выхадных. Сюды сцякаецца ўся аператыўная інфармацыя, менавіта тут рэагуюць на звароты і паведамленні грамадзян. Патэлефанаваўшы «102», чалавек павінен разумець, што ў лічаныя хвіліны яго пытанне будзе пераадрасавана ў аператыўна-дзяжурную службу па месцы жыхарства.**

Менавіта тут прымаюцца рашэнні аб адпраўцы на месца дарожна-транспартнага здарэння супрацоўнікаў ДПС, аб накіраванні ўчастковага на сямейны скандал, а міліцэйская нарада — на затрыманне падазраваных у злачынстве. Каб даведацца, з якімі яшчэ просьбамі звяртаюцца ў міліцыю, а таксама на сваё вочы пабачыць, як «дзяжурка» працуе знутры, карэспандэнты «Звязды» накіраваліся ва ўпраўленне ўнутраных спраў адміністрацыі Першамайскага раёна сталіцы.

### У БУДНІ — БОЛЬШ ДТЗ, ВЫХАДНЫМІ — СКАНДАЛАЎ

Пакуль адзін дзяжурны адказвае на звароты грамадзян па тэлефоне, другі рэагуе на паведамленні, якія прыйшлі ад службы «102» у электронным варыянце. Яшчэ адзін супрацоўнік міліцыі афармляе заявы падчас асабістай гутаркі з чалавекам, які, каб папрасіць дапамогі, прыйшоў у РУУС асабіста.

— З улікам гарадскога аддзела міліцыі ў дзень да нас у сярэднім паступае ад 150 да 180 паведамленняў, — расказвае **начальнік аператыўна-дзяжурнай службы Першамайскага РУУС падпалкоўнік міліцыі Сяргей ХІЛЮЦІЧ.** — Прычым не заўсёды ў выхадныя дні іх становіцца больш. Выхаднымі людзі ў асноўнай большасці знаходзяцца дома, таму рызыка трапіць у сітуацыю, дзе патрэбна дапамога супрацоўнікаў міліцыі, мінімальная. У будныя дні, у прывычнасці ў час пік, павялічваецца колькасць паведамленняў па лініі ДАІ. Асабліва іх шмат, калі ідзе ўскладненне дарожнай абстаноўкі з-за ўмоў надвор'я або з наступленнем цёмнага часу сутак.

Калі ў будні ў «дзяжурку» паступае больш выклікаў, звязаных з дарожна-транспартнымі здарэннямі, а таксама парушэннямі правілаў дарожнага руху, то па суботах і нядзелях супрацоўнікі міліцыі часцей выязджаюць на сямейна-бытавыя скандалы. Асноўная маса грамадзян адпачывае пасля працоўнага тыдня дома, некаторыя ўжываюць алкаголь, што нярэдка становіцца прычынай самых розных канфліктаў.

### ЧАС ПРЫБЫЦЦЯ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД СІТУАЦЫІ

Першамайскі раён — не самы маленькі ў сталіцы. Прычым актыўна ідзе яго забудова. А са з'яўленнем новых жыхароў адпаведна расце і колькасць зваротаў у міліцыю. Калі ў 2018 годзе за 11 месяцаў іх было крыху больш чым 50 тысяч, то за аналагічны перыяд гэтага года іх ужо за 57 тысяч.

Спецыфіка мясцовасці таксама накладае свой адбітак на праваахоўную абстаноўку. На тэрыторыі Першамайскага раёна знаходзіцца вялікая колькасць аб'ектаў, якія з'яўляюцца візіткай сталіцы. Узяць тую ж Нацыянальную акадэмію навук або Нацыянальную бібліятэку. Амаль палова цэнтральнай вуліцы Мінска — праспекта Незалежнасці — таксама на балансе Першамайскага. Як і адзін з найбуйнейшых гандлёвых цэнтраў сталіцы. Месца шматлюднае, гэтым акурат і карыстаюцца правапарушальнікі, а часам і злачынцы.



Адным словам, у аператыўна-дзяжурнай службе ніколі не бывае зацішша. То ў раёне здарылася дарожна-транспартнае здарэнне, то ў грамадзяніна нешта скралі, у тым ліку грошы з карткі, то пабіліся два нецвярозыя таварышы, то п'яны муж выганяе з хаты жонку... А яшчэ вельмі шмат неабыякавых грамадзян, якія не могуць прайсці міма аўтамабіля, што стаіць з парушэннем правілаў паркоўкі.

Па словах Алега Воінава, працягваецца фіксацыя высокага ўзроўню замежнай ваеннай прысутнасці каля заходніх граніц Беларусі. «Не можа не непакоіць той факт, што ва Усходняй Еўропе толькі ў межах праводзімых аперацый і місій на ратацыйнай аснове дыслацыруецца фарміраванне колькасцю звыш 10 тысяч ваеннаслужачых, — удакладніў генерал-маёр. — Пры гэтым пастаянна пашыраецца маштабы мерапрыемстваў аператыўнай і баявой падрыхтоўкі пры адначасовым павелічэнні колькасці асабовага складу, які ў іх удзельнічае. На тэрыторыі сумежных дзяржаў у непасрэднай блізкасці ад беларускай граніцы працягваецца актыўная ваенная дзейнасць, якая ўжо стала шматнацыянальнай. Гэта праяўляецца як у перагрупоўцы і істотным нарошчванні сіл і сродкаў, так і ў правядзенні сур'ёзных дадатковых мерапрыемстваў па аператыўнай і баявой падрыхтоўцы. І ў той жа час, калі можна было прадэманстраваць транспарэнтнасць і зняць напружанасць, паколькі манеўры, якія праводзяцца, сапраўды выклікаюць у нас занепакоенасць, нашы так званыя партнёры не лічаць неабходным даваць якую-небудзь інфармацыю».

Алег Воінаў таксама адзначыў і нежаданне нашых суседзяў абмяркоўваць праблемы за сталом перагавораў. «Іх крокі ў цэлым знаходзяцца далёка ад таго, што можна ўявіць у якасці выхаду з сітуацыі, якая склалася, — рэзюмаваў генерал-маёр. — Сёння ва ўмовах ігнаравання і аднабокай інтэрпрэтацыі дзяржавамі — членамі ЕС і НАТА шэрагу сваіх міжнародных абавязацельстваў ваенна-палітычная абстаноўка каля граніц Беларусі набывае ўсё больш напружаны і складана прагназуемы характар. Замест падтрымання і ўмацавання міждзяржаўных адносін ажыццяўляецца мэтанакіраваны ціск на Рэспубліку Беларусь фактычна па ўсіх кірунках з мэтай яе міжнароднай ізаляцыі, прыклейвання ярлыка дзяржавы-ізгоя».

**Вераніка КАНЮТА.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Савета Рэспублікі выказваюць глыбокія спачуванні Валянціне Фёдараўне Пятрушы, начальніку экспертна-прававога ўпраўлення, у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

Уладзімір ШАПО:

# «Я ЗАЎСЁДЫ БЫЎ НАРМАЛЬНЫ ЭГАІСТ»

**Прывабнасць мастацтва ў тым, што яно нікога не пакідае раўнадушным. Кожны знойдзе для сябе нешта цікавае: карціны, якія «западаюць» у самае сэрца, незвычайныя лёсы мастакоў... На адной выстаўцы можна цалкам адчуць бязмежную сілу чалавечага таленту і твораў, якія ён нараджае. «Звязда» разам з галерэяй «АртХаос» вырашылі пазнаёміць усіх з гэтай сілай.**

## ГАЛІНКІ ГЕНЕАЛАГІЧНАГА ДРЭВА

«Я займаўся гэтай справай свядома. Мастакамі не становяцца выпадкова. Зверху нехта даў мне гэтую «зорачку». Я ў пяць гадоў, а можа, і раней ведаў, што стану мастаком. У мяне ніколі ніякіх сумненняў не існавала, пры тым, што мастакоў у сям'і не было. Гэта абсалютная выпадковасць, тая самая «зорачка», — расказвае мастак Уладзімір Шапо.

**«Кожны мастак павінен аналізаваць, што адбываецца з народам, краінай, з ім самім і што будзе далей. Мы валодаем гэтымі ведамі».**

Страсць, любоў і сям'я — тры словы, якімі можна апісаць яго творчасць. Для Уладзіміра Дзмітрыевіча мастацтва — не проста прафесія, прызначэнне, а сямейная справа. Трое яго сыноў і дачка звязалі сваё жыццё з творчасцю. Сям'я Уладзіміра Шапо прадвызначыла не толькі яго погляды на жыццё, характар, але і паўплывала на творчасць. Свой род мастак называе «пасіянарным». На галінках генеалагічнага дрэва шмат цікавых людзей, пра якіх мастак з задавальненнем расказвае. Напрыклад, пра прадзеда-плытагона, які некалі асеў на Полаччыне і даў пачатак роду Шапо. Ці пра сваяка, які стаў прататыпам аднаго з кніжных герояў Уладзіміра Караткевіча. «Мой прадзед-плытагон нарадзіў пяць дзяцей. Адзін з іх сябраваў з Уладзімірам Караткевічам, якому расказаў пра свайго сваяка, урача, што аб'ездзіў паўсвету. Так у рамане «Чорны замак Альшанскі» з'явіўся герой Вітаўт-Шапо-Калавур-Лыганоўскі, князь Альшанскі. Я часта прыязджаю да «свайго» замка ў Альшанах і вельмі хачу, каб яго аднавілі», — расказвае Уладзімір Дзмітрыевіч.

Бацькі мастака таксама былі людзі неардынарныя. «Мае продкі, я, мае дзеці — усе лідары, пасіянарыі. Мне вельмі пашанцавала з бацькамі, яны былі цудоўнымі людзьмі. Мама прайшла вайну, вызваляла Мінск, Віцебск. У 17 гадоў прыпісала сабе яшчэ адзін год, каб трапіць на фронт. І ўсю вайну цягнула сувязь па лініі фронту. Яна была маленькая, і немцы яе не заўважалі, калі яна са сваёй катушкай паўзла. Бацька ваяваў разам з Пятром Машэравым. Пасля вайны скончыў Вышэйшую партыйную школу ў Маскве, быў вельмі актыўным камуністам. Ордэн Чырвонай Зоркі яму ўручаў баявы таварыш Пётр Машэраў. Бацька вельмі не любіў мастакоў, акцёраў, творчых людзей. Ён лічыў, што іх трэба адправіць на лесапавал. У нас з гэтай нагоды былі вялікія сваркі».

## КІМ ЯНЫ ЯШЧЭ МАГЛІ СТАЦЬ, ЯК НЕ МАСТАКАМІ?

Уладзімір Дзмітрыевіч сцвярджае, што з такімі генамі ён павінен быў стаць або мастаком, або камуністычным лідарам. Трэцяга не дадзена. «У нас парода лідараў. Кожны пасіянарны чалавек сам адчувае свой лёс і будуе яго», — тлумачыць ён. Таму нядзіўна, што, маючы такі генетычны падарунак, Аляксандр, Павел, Антон і Ксенія пайшлі па творчым жыццёвым шляху.

Аляксандр Шапо — вядомы скульптар, чые работы можна бачыць у многіх гарадах Беларусі. Напрыклад, «Куб мужнасці і тугі» ў Бабруйску, мемарыял «Памяць» на мінскім праспекце Дзяржынскага, помнік дойліду Іаану ў Полацку. Павел Шапо — мастак у шырокім сэнсе слова: мастак тэатра і кіно, жывапісец, дызайнер інтэр'ераў, сцэнарыст, пісьменнік. Антон Шапо робіць творы мастацтва з людзей, ён дырэктар папулярнага тату-салона «У лісіцы», запатрабаваны дызайнер інтэр'ераў, неардынарны жывапісец. Ксенія Шапо піша вершы, робіць пераклады і стварае скульптуры. Кожны з малодшых Шапо не спыняецца на адным занятку. Яны ўсе — рознабаковыя майстры, якія выяўляюць свае думкі і пачуцці рознымі спосабамі. І гэта таксама ў іх ад бацькі. Акрамя цыклаў карцін, у партфоліа Уладзіміра Шапо ўваходзяць і мноства дызайн-праектаў: прыродна-экалагічны музей горада Полацка, мемарыяльны комплекс «Звязда», прысвечаны ахвярам канцлагера ў Баравухе, Музей 121-га авіяцыйнага рамонтнага завода горада Кубінка (Маскоўская вобласць),







**«Я дакладна ведаю, што пасля агульнага захаплення грашамі і сексам прыйдзе Ісус Хрыстос і пакажа, што жыццё нашмат складанейшае».**

комплекснае рашэнне мастацкага асяроддзя Наваполацка і комплекснае рашэнне рэканструкцыі горада Дзісны.

«Калі дзеці падраслі, я ім казаў ні ў якім разе не ісці ў мастацтва, а выбіраць іншую прафесію. Тое, што я стаў мастаком, — вялікая перамога. Дзякуй богу, што я магу гэтым зарабляць грошы, утрымліваць вялікую сям'ю. Але, гледзячы на мяне, у якую яшчэ сферу маглі пайсці мае дзеці? Я адпрацаваў два гады пасля інстытута, таму што так было патрэбна па законе. І больш не хадзіў на працу. Я сам кіраваў сваім часам, мог спаць колькі заўгодна, у мяне ніколі не было кіраўнікоў — я працаваў сам на сябе. Дык кім яшчэ маглі стаць мае дзеці, калі не мастакамі?», — расказвае Уладзімір Шапо.

І хоць мастак не хацеў, каб дзеці звязалі сваё жыццё з мастацтвам, як бацька ён імі ганарыцца і паважае як калега. Майстар сцвярджае, што дынастычная пераемнасць, прычым не толькі ў мастацтве — адзін з фактараў актывізацыі культурнага жыцця ў краіне. Нельга разбураць радавыя, сямейныя каштоўнасці, раздзяляць бацькоў і дзяцей. «Я заўсёды быў нармальны эгаіст. Люблю сваю сям'ю, сваю радзіму — Прыдзвінне. Гэта аснова Беларусі». — падкрэслівае Уладзімір Шапо. І карціны ў яго тыповыя для «нармальнага эгаіста»: многія з іх прысвечаны роднаму Полацку, жонцы, сябрам, любімаму сабаку. Палотны адлюстроўваюць творцу, такія ж яркія, гучныя і неардынарныя, як і ён сам. Роднаму Полацку прысвечаны нават цэлы цыкл карцін. Напрыклад, карціна «Полацк», масток, які ідзе ад Сафіі, на ім мастак са сваёй жонкай і любімая такса Бішка. Кожны, хто наведваў горад над Дзвіной, бачыў гэтую карціну. Але толькі не так, як сам Уладзімір Шапо.

## ІДЗЕ ВАЙНА ЗА ЧАЛАВЕЧУЮ ДУШУ

«Я працягваю нацыянальныя традыцыі нашага народа. Я дакладна ведаю, што пасля агульнага захаплення грашамі і сексам прыйдзе Ісус Хрыстос і пакажа, што жыццё нашмат складанейшае. Сёння самая вялікая праблема — духоўнасць людзей, тут ідзе самая вялікая бітва. І я сваіх дзяцей накіраваў туды, дзе ідзе самая вялікая бітва — вайна за чалавечую душу. Дастаеўскі казаў: «Бог змагаецца з д'яблам, а поле бітвы — душа чалавечая», — адзначае майстар.

Акрамя роднай зямлі, шмат увагі Уладзімір Шапо ўдзяляе біблейскай тэматыцы. Цыкл «Мастакі і прарокі» аб'ядноўвае мастацтва і рэлігію, паказвае пачуцці, якія выклікаюць і абуджаюць гэтыя сферы, прымушае задумацца аб тым, што сапраўды важна. Найлепшымі работамі ў гэтым цыкле мастак называе «Распяцце» і «Хрыстос перад Пілатам». Духоўны, рэлігійны пачатак часта ўсплывае ў размове з мастаком. Хаця ён сам адзначае, што не лічыць сябе вельмі набожным чалавекам. Але ў Бога верыць і нават у камуністычныя часы хрысціў сваіх дзяцей.

«Мастацтва апраўдвае чалавека перад Богам. А што людзі сёння робяць?! Калі б не Бах, не Мікеланджэла, калі б не Рублёў ці Чайкоўскі, невядома, што б з намі было. Жанчыны нараджаюць вельмі прыгожых, добрых дзяцей. Адзін з іх можа стаць новым Рублёвым, а ўсе астатнія будуць рабіць гадасці», — разважае творца.

Уладзімір Шапо сцвярджае, што мастак — гэта больш, чым проста чалавек, які малюе. Ён, у першую чаргу, аналізуе. Таму творцу так не падабаецца журналісцкае пытанне накшталт «калі да вас прыходзіць муза?» Яна не прыходзіць па запрашэнні, каб намаляваць карціну. Мастацтва для Уладзіміра Шапо — стан душы, лад жыцця: «Мастак — гэта той, хто думае за ўсіх. Я аналізую ўсё, што адбываецца, і я павінен гэты аналіз паказаць. Гасподзь ужо зрабіў світанак, заход сонца, бярозкі, ракі. Гасподзь кажа, што чалавеку трэба ісці далей і ўсю дарогу думаць. Я вельмі люблю свае родныя бярозкі, гэта мае ўспаміны. Бярозкі я малюю, калі раблю эцюды, каб захаваць свае ўспаміны. А сапраўдная мастацкая работа прадугледжвае работу мозгу. Я аналізую, хто мы, адкуль прыйшлі і куды ідзём. Мастак — аналітык, ён сумленне народа. Нацюрморты і жанчын мы таксама малюем, але ў аснове заўсёды ляжыць пытанне «што гэта і навошта?» Кожны мастак павінен аналізаваць, што адбываецца з народам, краінай, з ім самім і што будзе далей. Мы валодаем гэтымі ведамі. Таму творамі мастацтва адны захапляюцца, а іншыя знішчаюць».

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Аліны МАЗАВЕЦ.**

# ПУХНАТЫЯ, ДУХМЯНЫЯ, ЭКАЛАГІЧНЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Акцыя «Захавай сімвал свята» праводзіцца па ініцыятыве Мінлясгаса ўжо трэці год, распавяла **прэс-сакратар Міністэрства лясной гаспадаркі Рэспублікі Беларусь Анастасія МАЦКЕВІЧ**.

— І калі напачатку мода на экалагічнасць была характэрная ў асноўным для вялікіх гарадоў, то сёння людзі паўсюдна ўсё часцей выбіраюць ялінку не ў зрэзцы, а ў жывым выглядзе — дрэўцу, якому можна захаваць жыццё.

Навагодняе дрэўца ў кадцы можна гадаваць да вясны і высадзіць у адкрыты грунт падчас акцыі «Тыдзень лесу». І такім чынам унесці свой уклад у азеляненне краіны. Зрабіць гэта вы можаце на дачы або асабістым падворку, а таксама звярнуцца ў любое лясніцтва — вам пакажуць, дзе ялінцы будзе ўтульней з пункту гледжання саставу глебы і мікраклімату.

Навагодняя ялінка ў вазоне (а дакладней у кадушцы) сёння ўжо перастала быць экзотыкай. Дзе вырошчваюць дрэўцы для рэалізацыі менавіта ў кадках? Напрыклад, у Смалявіцкім лясгасе. Сёлета, распавяла **начальнік гадавальніка Смалявіцкага лясгаса Алена СЫЦЬКО**, на 22 снежня было прададзена 47 елак у кадках, хоць гандаль навагоднімі дрэвамі пачаўся толькі 20-га. Для параўнання: летась такіх ялінак з каранёвай сістэмай было прададзена 36 за ўвесь сезон.

У кадках дрэўца абыдзецца пакупніку даражэй за ялінку ў зрэзцы. Затое жывая ёлка ў гаршку або скрыні — гэта карыснае і прыемнае «ў адным флаконе». Ігліца вылучае араматычныя лятучыя рэчывы, якія дэзынфіцыруюць паветра. Гэтыя рэчывы забіваюць мікробы і ўмацоўваюць як дыхальную, так і нервовую сістэму. Акрамя таго, з аднаго боку, не трэба высякаць жывое дрэўца, з іншага — падманваць сябе, што штучная ёлка здольна стварыць навагоднюю атмасферу не горш за сапраўдную лясную прыгажуню, з яе калючымі хваінкамі і пахам ігліцы.

Купіць ялінку ў кадцы можна і на ёлачных кірмашах у населеных пунктах, і непасрэдна ў лясгасе — тут набыццё абыдзецца танней, таму сюды едуць многія. Узнікаюць некаторыя складанасці з транспарціроўкай: каранёвая сістэма елкі досыць вялікая, і кадка атрымліваецца цяжкой. Іншая справа — калі вы на асабістым транспарце.

### ЗІМОЙ І ЛЕТАМ — АДНЫМ...

Выбраць ялінку ў скрыні — задача няпростая, бо на працягу месяца-паўтара пасля гібелі іглічная расліна «кансервуецца» ў сваім «жывым» аблічччы. Акрамя таго, бываюць выпадкі, калі людзі набываюць у прыватніка дрэва ў кадцы, а аказваецца, што гэта зрэзаная елка без усялякіх каранёў, якую проста ўваткнулі ў гаршчок.

Таму купляць жывую елку лепш у правераных прадаўцоў — напрыклад, у гадавальніку лясніцтва. Зразумець, наколькі здаровы хвойнік, можна па наступных прыкметах: галіны не павінны ламацца, іглы — абсыпацца пры дакрананні рук. Спецыялісты праінструктуюць вас, як расліну дагледзець. Цяпер, калі на вуліцы ўстойлівы мінус, ялінцы трэба даць час акліматызавацца. Важна правільна «пасяліць» яе — у самае прахалоднае месца. У чалавечым жыллі хвойнікам горача, душна і занадта суха. Лепш за ўсё елка будзе адчуваць сябе на зашклёным балконе. Вельмі важна падтрымліваць належную вільготнасць: апырскваць хатнюю ялінку з пульверызатара, у дастатковай колькасці паліваць. Занесці ў дом яе варта толькі на пару навагодніх дзён і не ставіць паблізу батарэй. А то, вырашыўшы, што прыйшла вясна, ялінка кранецца ў рост, і карані аслабнуць у цесным чыгуне.

Пасля таго, як святы пройдуць, елку лепш за ўсё вярнуць на балкон ці пасяліць на халодны верандзе. Наогул, ялінкі не прызначаны для жыцця пад адным дахам з чалавекам, так што з прыходам вясны іх трэба як мага хутчэй перасадзіць у адкрыты грунт — з камяком зямлі, асцярожна пераваліваючы, каб не пашкодзіць каранёвую сістэму.

Навагодняя ёлка вырошчваецца гадоў 5-6, распавядае **галоўны ляснічы Смалявіцкага лясгаса Аляксандр ГРЫШЧЭНЯ**. А пачынаецца ўсё з шышак — якраз гэтымі днямі ідзе іх збор. Шышкі паступаюць на перапрацоўку ў насенневодчы цэнтр, дзе з іх атрымліваюць насенне, з якога і вырошчваюць саджанцы — і для аднаўлення лясоў, і для навагодніх мэт. Увесну насенне высяюць у адкрыты грунт, а ў кастрычніку—лістападзе самыя прыгожыя і пухнатыя ялінкі перасаджваюць у кадкі. Для навагодніх ёлак пад высечку ствараюцца плантацыі на землях, якія выйшлі з сельскагаспадарчага выкарыстання. Праводзіцца спецыяльная падрыхтоўка глебы, а на месца высечаных пад Новы год ялінак падсаджваюцца новыя.

Для навагодняга гандлю вырошчваюцца елка еўрапейская (гэта звыклая нам зялёная ялінка) і елка калючая (у народзе яе называюць «блакітная елка» — у зрэзцы яна стаіць даўжэй і менш абсыпаецца).

— Сёлета пасеялі таксама насенне піхты Нордмана. Яна будзе выкарыстоўвацца для навагодніх мэт праз 3-4 гады, — расказаў галоўны ляснічы Смалявіцкага лясгаса.

Пакуль што піхты-аднагодкі растуць у цяпліцах, пазней іх перасеяць у адкрыты грунт.

### У АБАРОНУ ЕЛАК: РЭЙДЫ І ФОТАПАСТКІ

Яшчэ адзін клопат леснікоў напярэдадні зімовых свят — не дапусціць самавольнай высечкі елак. З 17 снежня дзяржаўная лясная ахова перайшла на ўзмоцнены варыянт нясення службы.

— З мэтай захавання прыродаахоўнага заканадаўства ў навагодні перыяд мы арганізоўваем рэйдавыя мерапрыемствы і ладзім пасты на аўтадарогах для кантролю за перавозкай елак, — распавёў **начальнік пажарна-хімічнай станцыі Смалявіцкага лясгаса Дзмітрый ГРЫЦКЕВІЧ**. — Правяраем машыны. І калі людзі вязуць елкі, удакладняем наяўнасць дазвольных дакументаў. У выпадку іх адсутнасці прыцягваем да адміністрацыйнай адказнасці. Пры сабе, перавозячы ёлку, варта мець талон на набытае навагодняе дрэва або раздрукаваны чэк, на некалькі елак — накладную. Рэйды праводзяцца сумесна з Дзяржаўтаінспекцыяй і з іншымі прыродаахоўнымі органамі.

Больш за ўсё, адзначае Дзмітрый Грыцкевіч, пакутуюць лясы ў ваколіцах вялікіх гарадоў.

— Але апошнім часам, дзякуючы такім рэйдам, інфармацыі ў СМІ, агітацыйным мерапрыемствам значна знізілася колькасць выпадкаў незаконнай вырубкі елак. Людзі разумеюць, што танней і прасцей дрэва купіць, чым секчы незаконна.

Куды не паспеюць прыродаахоўнікі, там парушэнні зафіксуюць фотапасткі. Сёння па краіне іх устаноўлена ў лясах каля паўтары тысячы, распавёў **начальнік аддзела аховы і абароны лесу, палявання і паляўнічага турызму Мінскай дзяржаўнай вытворчай лесагаспадарчай установы Дзмітрый ПІНЧУК**.

— Мы выкарыстоўваем фотапасткі з 2015 года. За шэсць гадоў іх колькасць павялічылася ў 10 разоў, — адзначыў спецыяліст.

Фотапасткі ўстанаўліваюцца для арганізацыі адзаназірання ў лясным фондзе, і перыядычна іх дыслакацыю мяняюць. Зараз фотапасткі знаходзяцца ў месцах канцэнтрацыі іглічных маладнякоў, а таксама вакол населеных пунктаў, садовых таварыстваў і ўздоўж аўтадарог. Камеры імгненна перадаюць здымкі прыродаахоўнікам, і гэта дазваляе дзяржаўнай ляснoй ахове аператыўна рэагаваць і неадкладна прымаць меры.

— Самавольныя высечкі навагодніх дрэў з кожным годам падаюць, — расказаў Дзмітрый Пінчук. — З аднаго боку, цэны на ёлкі даволі дэмакратычныя, з іншага — проста несупастаўныя са штрафамі за незаконную высечку.

Памер штрафу вар'іруецца ў залежнасці ад катэгорыі лясоў, дзе была ссечана ялінка. Для фізічных асоб штраф складае да 30 базавых велічынь. Плюс прыйдзецца аплаціць шкоду, прычыненую навакольнаму асяроддзю, у памеры адной базавай, а звыш таго — яшчэ і кошт елкі па прэйскуранце: ссечанае дрэўца застанецца парушальніку, але ў выніку атрымаецца сапраўды залатым. Так што значна прасцей адправіцца на найбліжэйшы ёлачны базар.



Начальнік гадавальніка Смалявіцкага лясгаса Алена СЫЦЬКО: «Навагоднее дрэўца ў кадцы можна гадаваць да вясны і высадзіць у адкрыты грунт падчас акцыі «Тыдзень лесу».

### І АБ ЦЭНАХ

Адправімся і мы. Ёлачны базар, дзе прадстаўлена прадукцыя Рэспубліканскага ляснога селекцыйна-насенняводчага цэнтра, знаходзіцца ў Мінску на Каменнай Горцы. Пакупніку тут прапануюць елку еўрапейскую і елку калючую, піхту Нордмана і сасну звычайную. Усё гэта як у зрэзцы, так і ў кадках. Цэны на елкі і хвоі ў зрэзцы пачынаюцца ад 15 рублёў і заканчваюцца на 98, у кадках навагоднія дрэвы тут таксама прапануюць у шырокім коштавым дыяпазоне — ад 22 да 98 рублёў.

— Сёлета памер самых запатрабаваных елак «падрос», — распавёў **дырэктар Рэспубліканскага лясного селекцыйна-насенняводчага цэнтра Уладзіслаў ЦЕЦЯРОНАК**. — Калі летась папытам карысталіся ялінкі вышынёй метр-паўтара, то сёння просяць ад двух метраў і вышэй.

У дзень, адзначыў суразмоўца, у сярэднім прадаецца 200—300 ялінак. І чым бліжэй да 31 снежня, тым попыт вышэйшы.

Ну, а калі ўсё ж вельмі хочацца менавіта ссекчы ялінку ў лесе — як у навагодняй песеньцы? І нават не з эканоміі (якой, відавочна, пры самавольнай высечцы не атрымаецца), а проста каб у поўнай меры адчуць атмасферу свята. Няўжо нельга? Аказваецца, можна. Дастаткова звярнуцца ў найбліжэйшае да вашага населенага пункта лясніцтва, і вам пакажуць, дзе можна выбраць і самастойна ссекчы навагодняе дрэўца. Каштуе такая паслуга літаральна некалькі рублёў.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, фота аўтара.**

---

Навагодні настрой

# А СУСЕД КУПЛЯЕ... ТЫГРА

## Наш карэспандэнт у Прыдзвінскім краі адправіўся на пошукі перадсвяточнай атмасферы

**Напярэдадні Новага года жыхары Віцебска атрымалі падарунак, які чакалі некалькі дзясяткаў гадоў, — запуск кола агляду каля галоўнай плошчы абласнога цэнтра. Калісьці гэты атракцыён знаходзіўся ў парку Савецкай арміі на ўскраіне Віцебска, але ў 90-я быў разабраны. Тады ж дэманціравалі і невялічкае дзіцячае кола ў парку Фрунзэ, недалёка ад плошчы Леніна.**

### КРУЦІЦЦА-КРУЦІЦЦА

Новая забава знаходзіцца ў парку Пераможцаў. Мантаж ажыццяўляўся з канца лета. Трыццаціметровая канструкцыя з дваццаццю закрытымі кабінкамі (у кожнай па чатыры пасажыры) прыкладна за сем хвілін робіць абарот.

У прэзентацыі бралі ўдзел кіраўнікі мясцовай улады. Вясёлае атрымалася мерапрыемства з багатай забаўляльнай праграмай і фаер-шоу. Кола ўпрыгожвае каля 540 святлодыёдных лямпачак. Ёсць магчымасць змяшчаць на ім ілюмінацыйныя тэксты: віншаванні, прызнанні ў каханні, аб'явы...

Атракцыён будзе працаваць кожны дзень пры спрыяльных умовах надвор'я. Табу на катанне, напрыклад, калі тэмпература паветра мінус 10 градусаў і ніжэйшая, пры моцным ветры і даждгы. Кошт задавальнення — 6 рублёў, малым — бясплатна.

### ТЭХНАЁЛКА

Сёлета колькасць намінацый у віцебскім конкурсе на найлепшае навагодняе ўпрыгожванне будынкаў, двароў, сквераў і паркаў павялічылася да 13. Актыўнасці хапае і ў гараджан. Усе ахвотныя могуць узяць удзел у акцыі па стварэнні навагодняй казкі. Пераможцам уручаць памятныя дыпломы і каштоўныя прызы.

Ёлкам і іншым навагоднім героям і аксесуарам прысвечана шмат падзей і мерапрыемстваў. Напрыклад, выстава-кірмаш навагодніх цацак і сувеніраў «Прыгажуня ёлка» можна ўбачыць у Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці. А ў Віцебскім абласным палацы дзяцей і моладзі прапанавалі зрабіць ёлкі з розных матэрыялаў. У гэтай установе прайшоў абласны этап рэспубліканскага конкурсу «ТэхнаЁлка». Юныя чараўнікі навучылі навагоднія дрэвы танцаваць, спяваць, мяняць колер. Усяго на конкурс было прадстаўлена больш за дзвесце экспанатаў пераможцаў і прызёраў раённых этапаў.

### ЖЫВУЮ ЦІ ШТУЧНУЮ?

З сярэдзіны снежня працуюць ялінкавыя базары. Дарэчы, прыкладна трэць плошчы Віцебскага лясгаса — хвойныя дрэвы, з кожным годам тут усё больш вырошчваюць ялінак да свята ў кадках. Аптымальна і для пакупнікоў, і для прыроды: калі стварыць патрэбныя ўмовы, дрэва можна будзе потым высадзіць у грунт. Каб павялічыць шанцы на поспех, нельга ставіць яго блізка ад батарэй ацяплення, абагравальных прыбораў. Штодня трэба добра паліваць зямлю і шчодра апырскваць хвою.

Толькі ў Віцебску сёлета працуе каля пятнаццаці базараў па рэалізацыі ялінак. Яны на рынках, каля буйных гандлёвых цэнтраў, прадпрыемстваў, у спальных раёнах, каля ўстаноў сацыяльнага прызначэння.

Найбольш папулярныя — вышынёй да 1,5 метра. Лясніцтва рэалізоўвае дрэўцы вышынёй да метра за 11,5 рубля, да двух — 14,5 рубля, да трох — 21 рубель.

Самая танная — метровая — штучная ялінка са Смаленскага рынку ўпрыгожыць ваш дом за 40 рублёў. За трохметровую просяць 550. Дарэчы, беларусы навучыліся вырабляць іх не горш за замежнікаў, пры гэтым у паўтара раза танней.

Дарэчы, штраф за незаконную высечку дрэў — да 870 рублёў. Фіксуюць парушэнні пры дапамозе фота і відэаапаратуры.

### САВЕЦКАЕ Ў МОДЗЕ

Вельмі багаты выбар ёлачных цацак. З кожным годам набіраюць папулярнасць цацкі савецкай вытворчасці.

На «блышыных радах» расказалі і пра рост цікавасці да старых фігурак Дзеда Мароза і Снягуркі, а яшчэ... да «бабулінага» посуду. У прыватнасці, вельмі хутка прадаецца фарфоравы набор: графін-шчупак і чаркі ў выглядзе маленькіх рыбак. Такія былі ў многіх савецкіх сем'ях.

Неяк каля пад'езда сустрэў суседа, які жыве паверхам вышэй. Ён вельмі радасна паведаміў, што купляе... тыгра! Пару гадоў таму, калі ён рабіў рамонт, на маёй кухні са сцяны ўпаў гадзіннік... Таму я адразу ўявіў некаторыя наступствы новай пакупкі. Калі сусед убачыў рэакцыю на маім твары, удакладніў, што афармляе дакументы на пакупку аўто «Opel Tigra». Потым будзе год Труса, падказае кітайскі каляндар, за ім — год Дракона, а потым — год Змяі... Не, лепш, хай падае гадзіннік.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 10 января 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)* |
|---|
| Нефтепродукт – обводненное (с примесями) сырье для производства нефтяных вязких дорожных битумов в количестве 1 100 тонн (ориентировочно), содержащийся в битумохранилище, расположенном по адресу: Минская область, Вилейский район, г. Вилейка, ул. Волкова, 43 |
| Начальная цена: 68 200,00 бел. руб. без учета НДС |
| Сумма задатка: 6 800,00 бел. руб. |

** Покупатель обязуется своими силами, средствами и за свой счет произвести вскрытие битумохранилища, выемку содержимого (продаваемого имущества) и вывоз с территории производственной базы. Окончательное количество продаваемого имущества определяется по мере выборки нефтепродукта с учетом его контрольного взвешивания.*

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **10 января 2022 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 28.12.2021 по 06.01.2022 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

---

Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б, www.ipmtorgi.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Строймаш», ул. Рыбалко, д. 26, 220033, г. Минск** |

| Лот, № | Предмет аукциона | Начальная цена, с НДС 20 % | Минимальная цена, с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | Имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, д. 17/6, в количестве 11 объектов | 33 335,28 бел. руб. | 25 927,44 бел. руб. |
| 2 | Имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, д. 17/4, в количестве 2 объектов | 8 866,80 бел. руб. | 6 896,40 бел. руб. |

**Дата и время начала и окончания торгов: 12.01.2022 в 09.00 по 12.01.2022 в 16.00.**
Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 3 минуты до окончания торгов. **Дата и время окончания приема заявок**: **10.01.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота (по всем лотам)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB 30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **7 %** от цены продажи лотов в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

**Контактные данные: +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by.**

---

# ОАО «Нафтан»
## РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ (с повышением начальной цены) бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:

| № п/п | Наименование объектов основных средств | Инв. № | Ед. изм. | Кол-во | Цена с НДС, руб. коп. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Система кондиционирования воздуха | 06274141 | шт. | 1 | 1008,00 |
| 2 | Мебель кухонная | 15210788 | шт. | 1 | 1519,20 |
| 3 | Стол рабочий | 15210789 | шт. | 1 | 199,20 |
| 4 | Стол для заседаний | 15210792 | шт. | 1 | 508,80 |
| 5 | Тумба-подставка под ксерокс | 15210794 | шт. | 1 | 198,00 |
| 6 | Тумба для документов | 15210797 | шт. | 1 | 168,00 |
| 7 | Шкаф встроенный | 15210798 | шт. | 1 | 577,20 |

Состояние удовлетворительное.

**Предложения принимаются по адресу:**
**211441, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 27 января 2022 года с пометкой на конверте «Реализация неликвидов, 27.01.2022» либо в электронной форме на e-mail: tender.box@naftan.by с вышеуказанной пометкой.**

**Извещение на проведение конкурса размещено на сайте www.naftan.by.**
**Контактные телефоны: 8 (0214) 59-89-26, 8 (0214) 59-88-42.**

УНП 300042199

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| |
|---|
| **ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-61031 (назначение – здание специализированное животноводства, наименование – здание конюшни), общей площадью 235,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Петревичский с/с, 17, здание конюшни, юго-восточнее д. Пудино.** Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424385200001000492, площадью 0,2125 га (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания конюшни), расположенном по адресу: Гродненская обл., Петревичский с/с, 17. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2.4, площадью 0,2125 га |
| Начальная цена продажи лота – 11 363,47 руб. (одиннадцать тысяч триста шестьдесят три рубля сорок семь копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 136 руб. (одна тысяча сто тридцать шесть рублей) |
| Продавец – ОАО «Лидахлебопродукт», 231300, г. Лида, ул. Булата, 1, 8-0154-65-25-01, факс 8-0154-65-25-60 |
| Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70 |
| Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225 001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 19 января 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3** |
| Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grino.by/aukcion. Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 26.10.2021 г. |
| **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)** |
| **Последний день приема заявлений – 17 января 2022 г. до 15.00** |

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**
**Дополнительная информация http://grino.by**

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| |
|---|
| **ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 450/С-24117 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – квасильно-засолочный цех), общей площадью 1002,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Минский Тракт, 32Ж.** Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425450100001009305 (целевое назначение – земельный участок для строительства и обслуживания квасильно-засолочного цеха), площадью 0,3377 га по адресу: г. Слоним, ул. Минский Тракт, 32Ж. Начальная цена продажи лота – 28 560 руб. (двадцать восемь тысяч пятьсот шестьдесят рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 2 856 руб. (две тысячи восемьсот пятьдесят шесть рублей) |
| Условия проведения аукциона – аукцион без условий |
| Продавец – Слонимский филиал Гроднооблпотребобщества, 231800, г. Слоним, ул. Маяковского, 6, тел. 8-01562-663-38 |
| Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70 |
| Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона |
| Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB3012050083322 5001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 24 января 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209** |
| Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion. Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 09.02.2021 г. |
| **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18** |
| **Последний день приема заявлений – 20 января 2022 г. до 15.00** |

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion**

---

# ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ
## по объекту «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло», опубликованную в газете «Звязда» от 05.08.2021 № 148 (29517) с дополнением от 10.08.2021 № 151 (29520), от 02.10.2021 № 190 (29559), от 27.10.2021 № 207 (29576), от 13.11.2021 № 220 (29589), от 10.12.2021г. № 239 (29608)

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика)

**Информация о застройщике:**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник-пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 05.08.2021 № 148 (29517) следующие дополнения:

**Сведения о количестве объектов долевого строительства (квартир), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования проектной документации:**

- 1 (одна) четырехкомнатная квартира № 161 (проектный) общей площадью по проекту 93,7 кв. метра на 6-м этаже 4-й секции. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1550 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежа составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1650 долларам США;

- 1 (одна) однокомнатная квартира № 40 (проектный) общей площадью по проекту 62,7 кв. метра на 1-м этаже 2-й секции. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1300 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежа составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1400 долларам США;

- 1 (одна) однокомнатная квартира общей площадью по проекту 48,4 кв. метра 1-й секции. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1600 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платеже составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1700 долларам США.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не будет установлена соглашением сторон, путем подписания дополнительного соглашения к договору.

Оплата первоначального взноса осуществляется в течение 7 календарных дней со дня регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе (если иной срок оплаты не будет установлен сторонами в договоре создания объекта долевого строительства), оставшаяся часть, в том числе при 100 % оплате цены договора, оплачивается в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договора создания объекта долевого строительства осуществляются не ранее чем через 5 календарных дней после опубликования настоящей декларации в порядке очередности обращения по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Если желающий принять участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и заблаговременно письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки (с предоставлением соответствующих документов), его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу. В таком случае застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное жилое помещение с другим претендентом.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс +375(17) 392-20-45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by, gastello.by.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Карысныя парады

# Каб навагоднія святы не сталі шокам для страўніка

**Лічаныя дні засталіся на Новага года, а пасля нядоўга чакаць і Каляд. Як адзначыць святы без шкоды для здароўя, калі на стале і ў халадзільніку столькі спакус? Карыснымі парадамі, якія дапамогуць захаваць сябе ў працаздольным стане, падзяліўся загадчык аддзялення гігіены харчавання Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Юрый ГУЗІК.**

## ЧАС ГАСТРЫТУ І ПАНКРЫЯТЫТУ

У чалавека павінен быць вельмі моцны страўнік, каб навагоднія празмернасці не «вылезлі праз бок». Калі ўспомніць, што звычайна гатуюць да свята, то можна пераканацца, якое гэта сур'ёзнае выпрабаванне для арганізма. Стол літаральна застаўлены шматлікімі салатамі тыпу аліўе, запраўленых вялікай колькасцю маянэзу. Акрамя іх, у меню смажаная мяса, каўбаскі, бульбачка, рыба ў разнастайных яе выглядах, марынады, вэнджаніна. Ужо не кажучы пра нязменныя дэсерты, у асноўным з тлустымі крэмамі. Страўнік адчувае сапраўдны шок, атрымліваючы гэта ўсё ў велізарнай колькасці, ды яшчэ і ў змешаным выглядзе.

Пры гэтым многія з нас маюць харчовую залежнасць, бо ежа — наш самы «асноўны інстынкт», і за адзін прысест за святочным сталом мы незаўважна для сябе можам з'есці 3-4 дзённыя рацыёны.

— Пасля вялікіх свят у гастраэнтэролагаў і іншых урачоў надыходзіць гарачая пара. У першыя дні студзеня па медыцынскую дапамогу часта звяртаюцца людзі з хранічнымі захворваннямі, якія абвастрыліся. Найперш гэта хваробы страўнікава-кішачнага тракта. Вінаватае пераяданне.Так, на фоне багатага прыёму ежы і ўжывання алкагольных напояў павялічваецца верагоднасць развіцця гастрыту і панкрэатыту. Таксама ў святы расце колькасць выпадкаў кішэчнага інфіцыравання — стравы ўсю ноч знаходзяцца на святочным стале пры пакаёвай тэмпературы, а пасля Новага года могуць доўга знаходзіцца ў халадзільніку і стаць крыніцамі атручэння, — кажа Юрый Гузік.

## НЕ КУПЛЯЙЦЕ І НЕ ГАТУЙЦЕ НА ЗАПАС

Адна з галоўных памылак у тым, што, пераядаючы з году ў год, мы не робім направак у навагоднім меню і працягваем купляць і гатаваць на запас больш, чым можам з'есці. А выкінуць шкада. Таму выконвайце некалькі простых парад перад застоллем і падчас яго.

### Напярэдадні свята

• Самае простае — гэта паступіць радыкальна, напрыклад, адмовіцца ад традыцыйных навагодніх страў. Пашукайце незвычайныя і складаныя рэцэпты, якія могуць абудзіць у вас гурмана.

• Засяродзьцеся не на колькасці, а на якасці прадуктаў, выбіраючы толькі самае вытанчанае і дарагое з таго, што можаце сабе дазволіць. Гэта натуральным чынам прыцішыць ваш застольны запал, не змяншаючы задавальнення ад свята.

• Прыдумайце насычаную забаўляльную праграму, якая ўключае фізічную актыўнасць, несумяшчальную з застоллем. Удзельнічайце ва ўсіх актыўнасцях, гуляйце, размаўляйце, весяліцеся — думаць аб ежы проста не будзе часу.

• Ні ў якім разе нельга галадаць ці абмяжоўваць сябе ў ежы напярэдадні свята, інакш рызыка зрыву рэзка ўзрастае.

• Упрыгожвайце і сервіруйце стол і ўсе стравы, якія падаюцца. Нават талерка з нарэзанай садавінай і агароднінай можа быць вельмі прывабнай, калі правільна яе аформіць.

### Падчас хатняга застолля

• Не сядайце за святочны стол дома ці ў гасцях на пусты страўнік, бо галодны чалавек з'ядае значна больш, чым сыты. За гадзіну перад застоллем варта злёгку перакусіць — ёгурт, бутэрброд ці фрукты.

• За 30 хвілін да прыёму ежы выпіце шклянку вады.

• Пакладзіце на сваю талерку больш розных страў для дэгустацыі. Мозг любіць разнастайнасць, і вы хутчэй насыціцеся ад візуальна вялікага аб'ёму.

• За сталом ешце павольна і невялікімі порцыямі, так можна паласавацца рознымі стравамі не на шкоду страўніку.



• Заядайце тлустую ежу вялікай колькасцю агародніны і зяленіва, гэта паскорыць працэс пераварвання.

• Па магчымасці аблягчайце стравы за кошт агародніны і нятлустых прадуктаў. Каўбасу можна замяніць на мяса, бульбу — на баклажаны або кабачкі, сыр узяць меншай тлустасці.

• Не запівайце ежу газаванымі напоямі. Сокі ў пакетах лепш замяніць на кампот, морс ці фрэш.

— На наступны дзень пасля святочнага застолля лепш перайсці на садавіну, малочныя прадукты, яйкі і крупы — ячныя, грэчкі, аўсянка. Клятчатка круп, а таксама пекціны садавіны і агародніны (толькі не бульбы) звязваюць і выводзяць з кішэчніка мноства шкодных рэчываў і нават лішкі тлушчу. У ячнsurvey бялку ёсць усе неабходныя амінакіслоты, таму яйкі могуць на час замяніць мяса. Акрамя таго, бялок утрымлівае рэчывы, якія паляпшаюць спальванне тлушчу і дапамагаюць нармалізаваць тлушчавы абмен, — раіць медык.

## ЧЫМ ДАПАМОГУЦЬ АНАНАСЫ?

Нагрузка на арганізм абцяжарваецца яшчэ і самым цёмным у годзе перыядам з працягласцю светлавога дня ўсяго 7—7,5 гадзіны. Абмен рэчываў у нас запавольваецца з прычыны павелічэння выпрацоўкі ў мозгу «гармону сну» мелатаніну. Штучнае асвятленне сітуацыю зусім не мяняе. Зніжаная хуткасць абмену рэчываў памяншае здольнасць арганізма пераў раўляць ежу і абясшкоджваць алкаголь.

Таму арганізму варта дапамагчы. Фермент, які аблягчае страваванне (брамелаін), утрымліваецца ў ананасах. У перыяд навагодніх свят іх можна ўжываць без асаблівых абмежаванняў. Стрававальныя ферменты прысутнічаюць таксама ў кісламалочных прадуктах — кефіры, сыроватцы, ражанцы, кумысе, айране і тане.

У прамежках паміж застоллямі налягайце на вінаградны сок і мёд. На ноч не лішні будзе прыём вітамінных прэпаратаў, якія змяшчаюць B1 і B6. Звярніце ўвагу, варта прымаць менавіта прэпараты з вітамінамі групы B, а не полівітаміны.

Вельмі важна падчас застолля не змешваць розныя алкагольныя напоі, бо такія «ёршы» даюць моцную нагрузку на печань, што рэзка зніжае здольнасць арганізма перапрацоўваць алкаголь і прадукты яго распаду. Выбірайце больш лёгкі алкаголь — брут, сухія віны, ром і гарэлка лепш за віскі, каньяк і мацаванае віно.

Закуска пасля выпітага павінна, апроч мяса, утрымліваць дастатковую колькасць гародніны. Часнок, хрэн, цыбуля, гарчыца, перац, воцат запавольваюць працэс акіслення алкаголю. А запіваць чарку гарэлкі салодкай газіроўкай або джын-тонікам — праверацы спосаб зваліцца пад стол раней за час.

## КАЛІ ВЕСЯЛОСЦЬ ВЫЙШЛА З-ПАД КАНТРОЛЮ...

Варта ўсведамляць, што няма ні аднаго медыцынскага прэпарату, які ўратуе ад пахмелля. Не верце рэкламе розных «антыпахмелінаў». Крыху палягчаюць ранішні стан і знімаюць млоснасць моцны булён і квашаная капуста. Антыпахмельнымі напоямі нездарма лічаць кумыс, айран і тан, але язвеннікам нельга імі захапляцца. Піва і любая салодкая слабаалкагольная газіроўка пусцяць вас па другім коле, і на наступную раніцу вам зноў трэба будзе спазнаць усе пакуты.

Некаторыя думаюць, што некалькі строгіх разгрузачных дзён адразу ж пасля багатых навагодніх застолляў дапамогуць прывесці сябе ў норму і скінуць лішнія кілаграмы. Але насамрэч гэта не так. Самы лепшы варыянт — вярнуцца да збалансаванага, здаровага харчавання, выключыўшы са штодзённага рацыёну лішнія, занадта каларыйныя і малакарысныя прадукты, але ні ў якім разе не садзіцца на строгую дыету. Таксама, разам са складаннем правільнага меню, ніколі не варта забываць і аб дастатковай фізічнай актыўнасці.

Ёсць пытанне!

# СУСТРАКАЦЬ ДОМА ЦІ Ў РЭСТАРАНЕ?

## Медыкі раяць устрымацца ад вялікіх кампаній і закрытых памяшканняў

**Другі Новы год запар планета будзе сустракаць ва ўмовах пандэміі. Распаўсюджванне каранавіруса накладвае свой адбітак на святкаванне — ісці ў госці да сваякоў, асабліва калі ў сям'і ёсць пажылыя людзі, па-ранейшаму непажадана. Гэтак жа рызыкоўна арганізоўваць застолле ў рэстаране ці кафэ — закрытае памяшканне і вялікая колькасць людзей таксама могуць скончыцца інфіцыраваннем.**

Ва ўмовах пандэміі кожны чалавек нясе адказнасць за распаўсюджванне COVID-19. Аб гэтым напярэдадні навагодніх свят нагадвае і Сусветная арганізацыя аховы здароўя, заклікаючы правесці іх бяспечна, — кажа **ўрач агульнай практыкі, загадчык аддзялення прафілактыкі 11-й гарадской паліклінікі Мінска Святлана ЯНУШКА.**

Вось некалькі парад па мерах засцярогі ад ковіду ў святочныя дні. Яны дапамогуць зменшыць рызыку інфіцыравання сябе, блізкіх, сяброў.

✓ Правядзіце навагоднія святы ў сямейным коле, па магчымасці, на свежым паветры — на дачы, за горадам.

✓ Устрымайцеся ад наведвання масавых мерапрыемстваў, асабліва тых, што праходзяць у зачыненых памяшканнях. Карпаратывы ў рэстаранах і кафэ ў гэтым плане — у групе рызыкі. Абмежаваныя прасторы банкетных залаў — спрыяльныя ўмовы для перадачы віруса ад чалавека да чалавека.

✓ Па-за памяшканнямі блізкія кантакты і масавыя зборы людзей таксама непажаданыя. Яны ўяўляюць патэнцыйную небяспеку для здароўя. Таму пазбягайце прагулак у людных месцах.

✓ Захоўвайце дыстанцыю 1,5-2 метры і не забывайце надзяваць маску ў грамадскім транспарце, гандлёвых цэнтрах і іншых месцах, дзе верагодная перадача інфекцыі.

✓ Максімальна абмяжуйце кантакты ў перыяд святочных дзён. Не захапляйцеся паходамі ў госці і запрашэннем дадому сваякоў і сяброў.

✓ Устрымайцеся ад паездак за мяжу і ў навагоднія святы. А пры планаванні падарожжаў уважліва вывучайце змены эпідэмічнай сітуацыі і каранцінных мерапрыемстваў у месцах адпачынку.

— Паспрабуйце зірнуць на надыходзячыя святы як на цудоўную магчымасць пабыць дома, з сям'ёй. Для таго каб адчуць цуд Новага года і Каляд, непатрэбныя далёкія краіны і дарагія падарункі. А каб убачыцца і паразмаўляць з роднымі людзьмі, з якімі вас разлучыў ковід, ёсць інфармацыйныя тэхналогіі, — раіць доктар.

Тым часам у залежнасці ад узроўню заражэння і цяжкасці сітуацыі кожная з еўрапейскіх краін па-свойму рэагуе на пандэмію каранавіруса. Але большасць з іх вяртае раней адмененыя абмежаванні і нават робіць іх больш жорсткімі, пры гэтым дазваляючы некаторыя паслабленні ў перыяд Каляд і Новага года.

**Германія,** напрыклад, аб'явіла жорсткі лакдаўн у спробе справіцца з рэзкім ростам захварвальнасці. Гэтыя меры працягнуцца да 10 студзеня, але на Каляды ў госці можна будзе паклікаць да чатырох блізкіх сваякоў.

**Францыя** замяніла другі нацыянальны лакдаўн камендацкай гадзінай з 20:00 да 06:00. У гэты час людзям забаронена пакідаць дамы без афіцыйнага дазволу. Затое ў дзённы час ім цяпер не трэба атрымліваць дазвол на выхад. Напярэдадні Каляд будзе зроблена выключэнне, але ў Новы год камендацкая гадзіна застаецца ў сіле. Бары і рэстараны будуць зачыненыя прынамсі да 20 студзеня.

**Лондан** і яго наваколлі трапілі ў найвышэйшую катэгорыю рызыкі з самымі цвёрдымі правіламі лакдаўну. Пабы і рэстараны застаюцца зачыненымі, але можна купляць ежу на вынас. Усе забаўляльныя ўстановы пад дахам будуць зачыненыя.

У **Бельгіі** напярэдадні Новага года забаронена запускаць феерверкі, аднак камендацкая гадзіна будзе скарочана з паўночы да пятай гадзіны раніцы.

СААЗ раіць па магчымасці збірацца на вуліцы, а калі ўсё ж без застолля не абысціся, то лепш рабіць гэта ў масках і з захаваннем дыстанцыі.

— Вы можаце адчуваць сябе няёмка, калі носіце маску і трымаецеся далей ад сяброў і сваякоў, затое гэта гарантуе бяспеку і захавае здароўе блізкіх вам людзей, — гаворыцца ў заяве СААЗ. — Людзі з групы рызыкі або пажылыя сябры і сваякі могуць не знайсці ў сабе сіл папрасіць вас выконваць дыстанцыю, але паспрабуйце ўвайсці ў іх становішча і зрабіце гэта самі, без нагадвання.

# НОВАЯ СТРАТЭГІЯ ЛІЧБАВІЗАЦЫІ КРАІНЫ






### Паважаныя калегі! Дарагія сябры!

*Прыміце шчырыя віншаванні з надыходзячым Новым годам і Растовом!*

*2021 год заняў важнае месца ў гісторыі Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Нацыянальны цэнтр абмену трафікам».*

*Сёлета мы вывелі на рынак новыя паслугі, удасканальвалі існуючыя сэрвісы і інфраструктуру, стварылі і ўкаранілі новую стратэгію лічбавізацыі краіны.*

*Наперадзе яшчэ шмат ідэй і кірункаў для развіцця, і мы ўпэўненыя, што ўсё атрымаецца дзякуючы прафесіяналізму і адказнаму падыходу да работы.*

*Дзякуем партнёрам і калегам за плённае супрацоўніцтва і выказваем упэўненасць у сумесных поспехах.*

*Напярэдадні надыходзячага 2022 года жадаем вам моцнага здароўя і дабрабыту. Няхай новы год прынясе новыя дасягненні і бліскучыя перамогі!*

**Дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «НЦАТ» А. А. Цымбалаў.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Штучны інтэлект, воблачная тэхналогіі, вялікія даныя, электронныя грошы, біяметрычная ідэнтыфікацыя — гэта тэндэнцыі сённяшняга дня, якія з кожным днём усё больш убудоўваюцца ў звыклы ўклад жыцця кожнага чалавека. Згодна з прагнозамі спецыялістаў, да 2025 года 58 % насельніцтва свету будзе ахоплена сеткамі 5G, 85 % карпаратыўных дадаткаў будуць воблачнымі, а 97 % буйных прадпрыемстваў пяройдуць на штучны інтэлект.

Як перайсці на больш высокі ўзровень электроннага ўзаемадзеяння дзяржавы, бізнесу і грамадства, грунтуючыся на сучасным узроўні развіцця інфармацыйных тэхналогій і максімальна выкарыстоўваючы існуючыя магчымасці дзяржаўнай інфраструктуры аказання электронных паслуг?

Як павысіць эфектыўнасць дзяржаўнага кіравання і знізіць выдаткі сацыяльных камунікацый для кожнага члена грамадства дзякуючы высокім тэхналогіям?

Як зрабіць працэсы ўзаемадзеяння грамадзян, бізнесу, розных галін улады і чыноўнікаў гранічна празрыстымі, хуткімі і зручнымі, што дазволіць эканоміць адзін з самых каштоўных рэсурсаў чалавека — час?

Як дабіцца поспеху ў фарміраванні талерантнага асяроддзя для ажыццяўлення лічбавай трансфармацыі і пашырэння маштабу IT-адукаванасці грамадства?

Адказы на гэтыя пытанні знаходзяць удзельнікі форумаў #GBC.

Форумы #GBC (Дзяржава. Бізнес. Грамадзяне) — дыялогавая пляцоўка для абмеркавання развіцця і перспектыў лічбавай будучыні Беларусі, на якой адбываецца дэманстрацыя дасягненняў і праектаў у галіне электроннага ўрада, а таксама ажыццяўляецца пошук новых шляхоў лічбавізацыі розных сфер узаемадзеяння дзяржавы, грамадства і бізнесу.

**Сярод асноўных тэм форумаў #GBC:**

- ахова інфармацыі, у тым ліку персанальных даных;
- развіццё інфраструктуры электроннага ўрада;
- увядзенне біяметрычных дакументаў, у тым ліку ID-картак;
- запуск канцэпцыі «Разумны горад», у тым ліку на рэгіянальным узроўні;
- рэалізацыя праектаў дзяржаўных органаў і арганізацый у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, а таксама перспектыўных распрацовак IT-кампаній.

Форумы #GBC праводзяцца пры падтрымцы Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Арганізатарамі форумаў #GBC з'яўляюцца Нацыянальны цэнтр абмену трафікам, Нацыянальны цэнтр электронных паслуг і Беларускія воблачныя тэхналогіі.

За 2021 год форумы #GBC ахапілі ўсю Беларусь: 28–29 красавіка адбыўся Першы міжнародны форум у Мінску, а ў перыяд з верасня да снежня былі праведзены рэгіянальныя форумы ў Гомелі, Брэсце, Гродне, Віцебску і Магілёве. Па ініцыятыве і, улічваючы важкі ўклад у лічбавае развіццё горада і раёна, быў праведзены ў снежні форум і ў Бабруйску.

За гэты перыяд часу форумы #GBC сабралі вялікую колькасць удзельнікаў: больш за 2000 чалавек у афлайн- і анлайн-фармаце — кіраўнікоў дзяржаўных органаў, міжнародных арганізацый, прадстаўнікоў IT-кампаній, банкаў, бізнесу і навучальных устаноў.

Для кожнага форуму #GBC (Дзяржава. Бізнес. Грамадзяне) была распрацавана свая ўнікальная праграма, якая закранула шэраг актуальных тэм.

2021 год адзначаны чарадой значных мерапрыемстваў. Падпісаны ўказ, у адпаведнасці з якім з 1 верасня уведзены ў дзеянне біяметрычныя дакументы, для чаго створана адпаведная інфраструктура.

Акрамя таго, атрымалі далейшае развіццё сістэмы міжведамаснага інфармацыйнага ўзаемадзеяння, якія з'яўляюцца базавымі кампанентамі электроннага ўрада, што дазваляе забяспечыць празрыстасць, бяспеку і зручнасць камунікацыі паміж грамадзянамі і дзяржавай. Варта адзначыць, што аб'ём дакументаў, якія перасылаюцца па СМДА, з кожным годам павялічваецца і ў 2021 годзе дасягнуў 93 %.

У цэнтры ўвагі форумаў #GBC таксама пытанні аховы інфармацыі і персанальных даных. Бо разам з павышэннем якасці жыцця, зніжэннем сабекошту выраблена прадукцыі, укараненне лічбавых рашэнняў нясе і пэўныя рызыкі. Прычым небяспека ўзнікае як для грамадства і дзяржавы ў цэлым, так і для кожнага чалавека паасобку.

У сувязі з гэтым, важна адзначыць, з 15 лістапада ўступіў у дзеянне закон аб ахове персанальных даных. Гэты закон з'яўляецца фундаментам у забеспячэнні абароны правоў і свабод фізічных асоб, звязаных з апрацоўкай іх персанальных даных, вызначае прынцыпы і парадак работы з персанальнымі данымі, уніфікуе працэс апрацоўкі персанальных даных і дае гарантыі ад незаконнага распаўсюджвання, прадастаўлення і выкарыстання персанальных даных фізічных асоб як у прыватнасці, так і ў цэлым.

Сярод іншых тэм форумаў #GBC абмяркоўваліся пытанні развіцця сацыяльнай сферы. Напрыклад, паспяхова ўкаранёныя і карыстаюцца папулярнасцю ў насельніцтва лічбавыя «ноу-хау» ў сферы аховы здароўя. Асаблівa варта ўдзяліць увагу стварэнню цэнтральнай платформы, на базе якой будуць працаваць усе бальніцы і паліклінікі нашай краіны. Платформа будзе ўключаць у сябе і электронны рэцэпт, які ўжо працуе, і электронныя гісторыі хвароб, і амбулаторныя карткі. Кожны грамадзянін будзе мець магчымасць зарэгістравацца на платформе і праз доступ у асабісты кабінет атрымаць кансультацыю не толькі ўрача, але і сацыяльнага работніка.

Навінкай 2021 года стаў дадатак «Вандрую без COVID-19», які з'яўляецца абавязковым для ўезду ў Расію, Азербайджан, Арменію, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Малдову, Таджыкістан і Узбекістан. Цяпер колькасць карыстальнікаў дадатку ўжо перавысіла 1 мільён.

Лічбавізацыя сферы адукацыі — не менш важны працэс. У краіне для гэтага распрацаваны і рэалізоўваецца шэраг праграмных дакументаў. Цяпер ідзе актыўная работа над стварэннем інфармацыйных платформаў для сістэмы адукацыі, уключаючы распрацоўку электронных вучэбных дапаможнікаў, дыстанцыйнае навучанне, анлайн-курсы, тэхналогіі віртуальнай і дадатковай рэальнасці, мабільнае навучанне, штучны інтэлект, гібкія патрабаванні да праграмы навучання, лічбавізацыю прафесійнай адукацыі і інш.

Сумесна з кампаніяй «Беларускія воблачныя тэхналогіі» тэстуецца праект па выкарыстанні тэхналогій дыстанцыйнага знімання паказанняў прыбораў уліку ў сістэме жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Транспартныя кампаніі адзначаюць эфектыўнасць электроннай дыспетчарскай. Новыя тэхналогіі прымяняюць у грамадскім транспарце, у службе таксі, у хуткай дапамозе, прыватных лагістычных кампаніях. Шэраг высокатэхналагічных праектаў знаходзіцца ў стадыі рэалізацыі. Адзін з іх — па аўтаматычным кіраванні святлафорамі ў залежнасці ад шчыльнасці дарожнага трафіку.

Цікава адзначыць: пры абмеркаванні на форуме #GBC транспартнай сферы генеральны дырэктар кіруючай кампаніі холдынга «Белкамунмаш» заявіў аб тым, што яны актыўна асвойваюць выпуск электробусаў, якія запатрабаваны не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Да канца 2021 года прадпрыемства плануе стварыць доследны ўзор электрычнага грузавога аўтамабіля, прызначанага для перавозкі грузаў унутры горада. У аўтамабілі будзе ўстаноўлена сістэма беспілотнага кіравання першага ўзроўню. Акрамя таго, актыўна абмяркоўваецца пытанне наконт стварэння міжгародніх электробусаў. У сваю чаргу, вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта» прэзентавала на форуме рэалізацыю пілотных праектаў з устаноўкай суперхуткіх зарадных станцый магутнасцю 350 кВт.

На форумах #GBC шырока абмяркоўваліся пытанні і лічбавыя рашэнні ў харчовай і лёгкай прамысловасці краіны. Перспектыўнымі вектарамі развіцця ў гэтых галінах адзначаны электронны гандаль, рабатызацыя вытворчасцяў, камерцыйны электронны дакументаабарот з краінамі Еўразійскага эканамічнага саюза.

Актуальнымі для абмеркавання на форумах #GBC таксама сталі кірункі развіцця сельскай гаспадаркі, якія разглядаліся ў цеснай узаемасувязі з інфармацыйнымі тэхналогіямі. Напрыклад, дакладнае земляробства. Варта адзначыць, што ў хуткім часе ў Мазырскім, Рагачоўскім, Светлагорскім раёнах будуць укараняць сучасныя тэхналогіі дакладнага земляробства з дапамогай тэхнікі прадпрыемства «Гомсельмаш». Галоўная задача заключаецца ў тым, каб пастаўшчыкі тэхналагічных рашэнняў і вытворцы тэхнікі ад'ядналі намаганні для ўкаранення інавацый на кожнае прадпрыемства.

Актыўны ўдзел у рабоце форумаў #GBC узялі прадстаўнікі прыватнага бізнесу, у прыватнасці, IT-сферы. Галоўная мэта такога ўзаемадзеяння — умацаванне дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

Кампанія Huawei, у прыватнасці, на форуме #GBC прэзентавала рашэнне па стварэнні сістэмы Intelligent Twins («Інтэлектуальных двайнікоў»), якая вядзе да інтэлектуальнай трансфармацыі гарадоў, прамысловасці і бізнесу.

Кампаніі «Авектыс», «Адкрытыя тэхналогіі», «ІнаТэх Салюшнс», «МультыТэк Інжынірынг», ZTE, прадстаўляючы свае рэалізаваныя кейсы на форумах #GBC, для садзейнічання лічбавай трансфармацыі выказалі гатоўнасць распрацоўваць і прадастаўляць перадавыя ІКТ-рашэнні, разгортваць ІКТ-інфраструктуру і платформы новага пакалення.





## ДАВАЙЦЕ РАЗАМ БУДАВАЦЬ НОВУЮ СТРАТЭГІЮ ЛІЧБАВІЗАЦЫІ КРАІНЫ!

Чаму неабходна ўзяць удзел у будучых форумах #GBC (Дзяржава. Бізнес. Грамадзяне)?

### Дзяржаўныя органы і арганізацыі

Вы пачуеце рэальны досвед лічбавай трансфармацыі «калег па цэху», зможаце абмяняцца досведам.

Пазнаёміцеся з рашэннямі і прадуктамі, якія дазволяць аптымізаваць Вашы бізнес-працэсы і вытворчасць.

Зможаце шырока прарэкламаваць свой брэнд, стаўшы Партнёрам форуму.

### Банкі

Удзел у форуме дасць магчымасць прадставіць актуальную інфармацыю аб паслугах, праектах, праграмах Вашага банка, паслужыць крыніцай дадатковай рэкламы.

Вы зможаце прыцягнуць новых кліентаў.

### IT-кампаніі і вытворцы абсталявання

Вы зможаце данесці тэхналагічную і эканамічную прывабнасць Вашай кампаніі да кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый — Вашых патэнцыяльных заказчыкаў.

У Вас з'явіцца ўнікальная магчымасць пагутарыць і задаць пытанні першым асобам, а таксама асобам, якія прымаюць рашэнні, буйных прамысловых (і не толькі) прадпрыемстваў.

Калі станеце Партнёрам форуму, Вам адкрыюцца шырокія рэкламныя магчымасці, якія будуць садзейнічаць пошуку новых Партнёраў і кліентаў.

### Малы і сярэдні бізнес, startup

У Вас з'явіцца магчымасць заявіць аб сваім бізнесе і яго паслугах і прадукцыі на шырокую аўдыторыю, выкарыстоўваючы рэкламныя магчымасці Партнёра форуму.

Вы даведаецеся самую свежую інфармацыю аб дасягненнях і навінках у галіне лічбавізацыі, якія зможаце выкарыстоўваць для развіцця свайго бізнесу.

Калі Вы хочаце ўзяць удзел або стаць Партнёрам форуму #GBC (Дзяржава. Бізнес. Грамадзяне), звяжыцеся з намі ў адпаведнасці з кантактамі ніжэй:

tel. +375173284732 e-mail. gbcforum@ncot.by
mob. +375445521511 gbcforum.by
gbcregions.by

УНП 191435810

# КАМУНАЛЬНЫЯ ЖАХІ

## Чаму ў краінах Балтыі нарастаюць пратэсты?

**Кошт ацяплення для жыхароў Вільнюса павялічыўся больш чым удвая. Жыхары стандартнай двухпакаёвай кватэры ў літоўскай сталіцы, напрыклад, заплацілі за ацяпленне ў лістападзе 84 еўра. Гэта на 214 працэнтаў больш, чым год таму. У іншых прыбалтыйскіх рэспубліках сітуацыя такая ж крытычная, паведаміў аналітычны партал RuBaltic. Жыхары актыўна выказваюць сваё незадавальненне дзеяннямі ўлад. У краінах Балтыі нарастаюць масавыя «камунальныя» пратэсты.**




### ЦЯЖКІ СЕЗОН

Прыбалтыка адмаўляецца ад доўгатэрміновых кантрактаў з «Газпрамам», але прывязваецца да еўрапейскіх рынкаў, дзе ваганні цэн на газ прыводзяць да балючых для эканомікі наступстваў. У выніку насельніцтва Літвы ўжо не здольна нармальна ацяпляць сваё жыллё ў асенне-зімовы перыяд, піша Baltnews.

Хаатычны пераход на аднаўляльныя крыніцы энергіі (АКЭ) не прынёс краінам ЕС нічога, акрамя страт. Нестабільная работа сонечных батарэй і ветраных генератараў прымусіла дзяржавы Еўрасаюза закупляць вугаль і газ, цэны на якія з пачатку восені дэманструюць гістарычныя рэкорды.

Відавочна, што гэты ацяпляльны сезон для Еўропы вельмі цяжкі. Нават у Германіі найбуйнейшы энергетычны канцэрн E.ON адмовіўся складаць дагаворы з канчатковымі спажыўцамі на пастаўкі газу з-за росту цэн, а электрастанцыя Bergkamen-A прыпыніла работу з-за недахопу вугалю.

У краінах з больш слабой эканомікай сітуацыя засмучае не менш. Літва і Польшча пачалі актыўна закупляць у Беларусі драўняныя пелеты, а Эстонія раскансервавала ўсе магутнасці электрастанцый у Нарве, хоць яшчэ нядаўна ўлады гэтай краіны заяўлялі, што да 2030-га поўнасцю адмовяцца ад спальвання гаручых сланцаў.

> **«Сацыяльна-палітычны выбух, да якога вядзе энергетычны крызіс у краінах Балтыі, стане натуральнай рэакцыяй мясцовага насельніцтва на правальную энергетычную палітыку кіраўніцтва Эстоніі, Латвіі і Літвы, — заўважыў RuBaltic. — Гэты энергетычны крызіс спароджаны тымі догмамі, якія прыбалтыйскія палітыкі год за годам адстойвалі ў энергетыцы. Сітуацыя на рынку прадэманстравала, што догмы не адэкватныя рэальнасці. І зараз за іх час адказваць».**

Зрэшты, праблемы паўставалі яшчэ да энергетычнага крызісу. Паводле даных Eurostat, летась, калі попыт на электрычнасць і ацяпленне быў сур'ёзна паніжаны на фоне пандэміі і лакдаўнаў, у сярэднім каля 8 працэнтаў насельніцтва краін ЕС не магло ў дастатковай ступені абаграваць свае дамы. Прычым Літва знаходзіцца ў самым пачатку гэтага сумнага рэйтынгу.

Вынікі даследавання, праведзенага спецыялістамі Eurostat, сведчаць, што самыя сур'ёзныя праблемы з цеплазабеспячэннем назіраюцца ў Балгарыі. Летась 27 працэнтаў жыхароў гэтай краіны прызналіся, што не маглі падтрымліваць дастатковую тэмпературу ў сваім жыллі. На другім месцы Літва з паказчыкам 23 працэнты. Замыкае тройку ў гэтым антырэйтынгу Кіпр (21 %). Чацвёртае і пятае месцы займаюць Партугалія і Грэцыя (па 17 %).

Характэрна, што ў гэтым спісе толькі Літва адносіцца да паўночных краін. Вядома, у Балгарыі клімат таксама кантынентальны, але ўсё ж зімы тут не настолькі халодныя, як у балтыйскай дзяржаве. Грэцыя, Кіпр і Партугалія ўвогуле маюць мяккі клімат, пры якім недастатковае ацяпленне жылля хоць і прыводзіць да шэрагу нязручнасцяў, але ўсё ж не пагражае жыццю.



У Літве сітуацыя кардынальна адрозніваецца. Калі жыхары не будуць у дастатковай меры ацяпляць дамы, то рызыкуюць як мінімум зарабіць сур'ёзныя праблемы са здароўем. Але амаль чвэрць насельніцтва проста не ў стане падтрымліваць неабходны ўзровень тэмпературы ў жыллі. Прычына — занадта высокія тарыфы.

### РАСПЛАТА ЗА «ГУЛЬНІ ГРЭТЫ»

Кошт жыллёва-камунальных паслуг у Літве павышаўся і без уплыву энергакрызісу. Напрыклад, зацвярджаючы цэны на энергарэсурсы для бытавых спажыўцоў на 2020 год, Дзяржаўная служба рэгулявання энергетыкі Літвы анансавала рост цэн на электрычнасць у сярэднім на 15 працэнтаў. Пры гэтым кошт газу ў той перыяд паабяцалі нават зменшыць на 17—22 працэнты.

Аднак пасля таго, як на спотавых рынках Еўропы рэкордна ўзраслі цэны на блакітнае паліва, тарыфы ў Літве пачалі павышацца яшчэ мацней. Як паведаміў дзяржаўны энергетычны холдынг Ignitis, з ліпеня ў балтыйскай краіне для большасці спажыўцоў кошт электраэнергіі павялічыўся на 8 працэнтаў, а газ для хатніх гаспадарак — на 36,8 працэнта. Услед за цэнамі на электрычнасць і газ «пацяжэлі» плацяжы за ацяпленне.

**Літоўскі палітолаг Вадзім ВАЛАВОЙ** адзначыў Baltnews, што асноўныя рэсурсы, якія выкарыстоўваюць для цэнтралізаванага ацяплення ў балтыйскай краіне, — газ і біяпаліва. Там, дзе дамінуе газ, напрыклад у Вільнюсе, цэны растуць хутчэй. Па словах палітолага, у краіне ўжо існуе такое паняцце, як энергетычная беднасць. З улікам росту цэн людзі вымушаны эканоміць на ацяпленні. Хтосьці ўключае яго крыху пазней, хтосьці збірае грошы, каб аплаціць даўгі за камуналку. «У гэтай сітуацыі ва ўрада Літвы ёсць два выхады. Можна або вырашаць праблемы комплексна, або шукаць спосабы крыху амартызаваць рост цэн рознымі палітычнымі рашэннямі. Першы варыянт уключае заключэнне прамых дагавораў з пастаўшчыкамі. Напрыклад, доўгатэрміновых кантрактаў з «Газпрамам», — распавёў Вадзім Валавой.

Але знешнеэнергетычная палітыка Літвы, сцвярджае эксперт, скіравана на дыверсіфікацыю і зніжэнне спажывання менавіта расійскага газу. Таму ўрад шукае іншыя шляхі, якія могуць прадухіліць шокавы рост цэн і зрабіць яго мякчэйшым. Адным з такіх рашэнняў з'яўляецца растэрміноўка на аплату ацяплення для літоўцаў. Вядома, гэта не вырашыць праблему, але дапаможа хоць крыху замаскіраваць яе і пазбегнуць «камунальных бунтаў».

Рост тарыфаў у балтыйскай краіне выкліканы агульнаеўрапейскім энергакрызісам. Палітыка дыверсіфікацыі, якая павінна была зрабіць Літву незалежнай ад расійскага газу, у выніку прывязала краіну да ваганняў на рынках Еўропы і стала прычынай энергадэфіцыту. «Прыхільнасць кіраўніцтва балтыйскай краіны кліматычнаму парадку дня, а таксама ўстойлівае жаданне адмаўляцца ад расійскіх вуглевадародаў дазваляе палітыкам Літвы даказваць сваю лаяльнасць Еўракамісіі з яе «зялёнай здзелкай» і нападкамі на «Газпрам». Вось толькі расплачвацца за ўсе гэтыя «гульні Грэты Тунберг» даводзіцца насельніцтву і бізнесу, прычым як буйному, так і малому», — адзначыў Baltnews.

### ПРАБЛЕМЫ З РУХАВІКОМ

88-гадовая жыхарка Клайпедскага раёна Ануце Барткявічэнэ сказала, што, убачыўшы рахунак, ледзь не страціла прытомнасць, паведаміў тэлеканал LNK. «Фільм жахаў, — заўважыла другая жыхарка. — Людзі кажуць, што сумы за год выраслі ўтрая, страшна падумаць, што будзе, калі пахаладае. Мы палічылі: калі зімой будзе мінус 20, атрымаецца па 500 еўра».

У суседняй Латвіі людзі проста з жахам чакаюць снежаньскіх плацежак. Пастаўшчык прыроднага газу для насельніцтва Latvijas Gaze абвясціў аб павелічэнні тарыфаў для спажыўцоў на 54—93 працэнты — у залежнасці ад памераў спажывання. У Эстоніі газ для прыватных спажыўцоў зараз каштуе 0,66 еўра за кубаметр, а з новага года павялічыцца да 1,27 еўра — рост амаль удвая.

Улады балтыйскіх краін замест кардынальнага вырашэння праблемы шчодра дзяліліся лайфхакамі. Так, жыхарам Латвіі параілі ўключаць электрапрыборы толькі ноччу, паколькі тады самыя нізкія тарыфы. Прэм'ер-міністр Эстоніі Кая Калас рэкамендавала людзям у мэтах эканоміі карыстацца пральнымі машынамі толькі ўначы, а таксама ўцяпляць свае дамы.

Экспанентальны рост камунальных тарыфаў правакуе ў Літве, Латвіі і Эстоніі новы эканамічны крызіс. Прычынна-выніковая сувязь тут вельмі простая. Літоўцы, латышы і эстонцы ўжо пераходзяць на рэжым жорсткай эканоміі, каб выцягнуць непасільную ношу аплаты камунальных паслуг. Паводле сацыялагічных апытанняў, 40 працэнтаў жыхароў Літвы, 57 працэнтаў жыхароў Латвіі і 65 працэнтаў жыхароў Эстоніі дзеля аплаты жыровак гатовы зрэзаць усе свае астатнія выдаткі.

Такая сітуацыя самым непасрэдным чынам адаб'ецца на эканоміцы. Фінансавая мадэль постсавецкай Прыбалтыкі заснавана на сферы паслуг. Яны ствараюць больш за палову ВУП Літвы, Латвіі і Эстоніі. Паспяховае функцыянаванне такой мадэлі заснавана на ўнутраным спажыванні. Спажыванне насельніцтва — рухавік эканомікі. У краінах Балтыі яно падганяецца самымі рознымі стымуламі, у тым ліку нярынкавымі: датацыі Еўрасаюза, грашовыя пераводы працоўных мігрантаў пакінутым на радзіме сем'ям.

### КРУТОЕ ПІКЕ

Як адзначаюць спецыялісты, татальная эканомія большасці насельніцтва на ўсім астатнім спажыванні дзеля таго, каб аплаціць непад'ёмныя камунальныя паслугі, вядзе да дэградацыі попыту ў краінах Балтыі, і з-за гэтага Літва, Латвія і Эстонія могуць уляцець у новае крутое эканамічнае піке.

«Пасля гэтага ўжо будзе няважна, з-за чаго ў краінах Балтыі пачаліся масавыя пратэсты: з-за касмічных тарыфаў на газ і цяпло ці з-за эканамічнага крызісу, выкліканага сітуацыяй на рынку камунальных паслуг. Прычына ў любым выпадку адна — стратэгічна памылковая энергетычная палітыка прыбалтыйскіх урадаў, якую яны паўтара дзесяцігоддзі не толькі праводзілі ў сваіх краінах, але і навязвалі ўсяму Еўрапейскаму саюзу», — адзначае RuBaltic. Атамную энергетыку ў краінах Балтыі ліквідавалі, у газавай энергетыцы шмат гадоў разбуралі ўсялякія магчымасці для канструктыўнага супрацоўніцтва з Расіяй і аддавалі перавагу не нармальным адносінам з «Газпрамам», а амаль забытым цяпер ЗПГ-тэрміналам.

Замест стабільных і надзейных крыніц таннай энергіі прыбалтыйскія палітыкі рабілі стаўку на развіццё самых дарагіх на рынку і пры гэтым бескарысных у крызіс тэхналогій накшталт біяпаліва і зялёнай энергіі, а з энергакольца БРЭЛЛ (Беларусь — Расія — Эстонія — Латвія — Літва), якое цяпер ратуе краіны Балтыі, насуперак усім разумным меркаванням плануюць выйсці.

«Сацыяльна-палітычны выбух, да якога вядзе энергетычны крызіс у краінах Балтыі, стане натуральнай рэакцыяй мясцовага насельніцтва на правальную энергетычную палітыку кіраўніцтва Эстоніі, Латвіі і Літвы, — заўважыў RuBaltic. — Гэты энергетычны крызіс спароджаны тымі догмамі, якія прыбалтыйскія палітыкі год за годам адстойвалі ў энергетыцы. Сітуацыя на рынку прадэманстравала, што догмы не адэкватныя рэальнасці. І зараз за іх час адказваць».

Для прыбалтаў энергабяспека заўсёды была пытаннем палітычным, а не эканамічным, заўважыў Baltnews. «Гэта значыць, што ўсе выдаткі за «ліберальны фундаменталізм» і страх перад «расійскай пагрозай» лягуць на плечы радавых грамадзян. Людзі, якім даводзецца плаціць вялізныя грошы за камунальныя паслугі, наўрад ці будуць задаволены. Прыбалтыцы варта рыхтавацца да новых хваль мітынгаў і выступленняў», — лічыць Baltnews.

У эканоміцы замацаваліся негатыўныя тэндэнцыі. Паводле прагнозаў The Wall Street Journal, інфляцыя ў еўразоне складзе 4,5 працэнта. Антырэкардсменамі стануць Эстонія і Літва, дзе скачок інфляцыі самы вялікі. Эканамісты прагназуюць, што ў Літве ў найбліжэйшы час інфляцыя будзе двухзначная. Летась значная частка жыхароў краін Балтыі была схільная да рызыкі беднасці або сацыяльнай ізаляцыі, сведчаць даныя Eurostat. У Латвіі паказчык складаў 25,1 працэнта насельніцтва, у Літве — 24,5 %, а ў Эстоніі — 22,8 %. Відавочна, што сёлета гэтыя трывожныя лічбы адчувальна павялічацца. Адпаведна ўзрасце і пратэсны патэнцыял.

**Пётр ДУНЬКО.**

# Результаты проведения рекламной игры
# «+30. ЖАРКИЙ СЕЗОН ПРИЗОВ!»

**Сведения о рекламной игре:**
Наименование рекламной игры: **«+30. Жаркий сезон призов!».**
Территория проведения: Республика Беларусь.
Период проведения: с 7 августа 2021 г. по 30 декабря 2021 г.
В рекламной игре приняли участие 122 628 участников.
Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.
Победителем 1 (одного) приза «Денежный приз 30 000 белорусских рублей и денежные средства в размере 4 460,34 белорусского рубля» стал Милевич Константин Владимирович.
Победителями 9 (девяти) призов «Электросамокат Hoverbot MV-02 / HVBTMV2 и денежные средства в размере 126,86 белорусского рубля» стали:

| № | ФИО | № | ФИО | № | ФИО |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Юрок Альберт Петрович | 4 | Камеко Алексей Николаевич | 7 | Лазарева Валентина Ивановна |
| 2 | Бегун Игорь Александрович | 5 | Катеринский Михаил Михайлович | 8 | Подобед Александр Павлович |
| 3 | Буяновский Андрей Петрович | 6 | Грудько Николай Адамович | 9 | Пармон Виктор Леонидович |

Победителями 9 (девяти) призов «Мобильный кондиционер Ballu BPAC-09 CE и денежные средства в размере 105,79 белорусского рубля» стали:

| № | ФИО | № | ФИО | № | ФИО |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Тарасевич Александр Иванович | 4 | Нечаев Николай Васильевич | 7 | Линник Елена Александровна |
| 2 | Пичиц Сергей Алексеевич | 5 | Басманов Александр Николаевич | 8 | Глазовский Юрий Михайлович |
| 3 | Щекало Антонина Викторовна | 6 | Викторович Татьяна Михайловна | 9 | Кузьменкова Анастасия Владимировна |

Победителями 30 (тридцати) призов «Гамак Gamak.by BB392K без брусков (морковный) и денежные средства в размере 21,97 белорусского рубля» стали:

| № | ФИО | № | ФИО | № | ФИО |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Миронович Михаил Владимирович | 11 | Петровский Андрей Сергеевич | 21 | Ситник Сергей Михайлович |
| 2 | Мелюк Андрей Александрович | 12 | Петухов Анатолий Михайлович | 22 | Рыжиков Александр Викторович |
| 3 | Каюшникова Раиса Ивановна | 13 | Басов Максим Сергеевич | 23 | Чайко Ирина Михайловна |
| 4 | Смирнова Наталья Викторовна | 14 | Иванюта Дмитрий Евгеньевич | 24 | Дейнеко Ирина Александровна |
| 5 | Масько Леонид Леонидович | 15 | Шапетько Сергей Викторович | 25 | Ильюк Александр Васильевич |
| 6 | Процык Арина Сергеевна | 16 | Емельянов Олег Владимирович | 26 | Бальцевич Яна Леонидовна |
| 7 | Трофименков Тимур Федорович | 17 | Ромашко Евгений Васильевич | 27 | Иванов Владимир Александрович |
| 8 | Чернышов Александр Алексеевич | 18 | Волчик Евгений Кузьмич | 28 | Заблоцкий Дмитрий Иосифович |
| 9 | Федченко Сергей Иванович | 19 | Юзлович Александр Михайлович | 29 | Солоненко Павел Николаевич |
| 10 | Лягаева Джамиля Набиджановна | 20 | Зеленкова Ольга Николаевна | 30 | Харланчук Василий Михайлович |

Победителями 100 (ста) призов «Кружка термическая метал., 300 мл, «Elite» упак., черный» стали:

| № | ФИО | № | ФИО | № | ФИО |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Войтехович Александр Васильевич | 35 | Скворцов Леонид Николаевич | 69 | Баранова Елена Николаевна |
| 2 | Шаблицкая Анастасия Викторовна | 36 | Василюк Марк Казимирович | 70 | Сафонова Екатерина Николаевна |
| 3 | Киселёва Татьяна Сергеевна | 37 | Боброва Каролина Владимировна | 71 | Гриньков Александр Федорович |
| 4 | Маринич Виктория Николаевна | 38 | Реут Ирина Андреевна | 72 | Похомов Сергей Александрович |
| 5 | Иваненко Марина Викторовна | 39 | Стрельская Светлана Юрьевна | 73 | Жартун Светлана Феликсовна |
| 6 | Дмитриева Юлия Александровна | 40 | Сулим Ольга Анатольевна | 74 | Левковская Анна Юрьевна |
| 7 | Головач Максим Владимирович | 41 | Косик Марина Николаевна | 75 | Марковец Виталий Николаевич |
| 8 | Фралков Эдуард Викторович | 42 | Василевская Алеся Валентиновна | 76 | Волк Сергей Иванович |
| 9 | Хаирова Марина Александровна | 43 | Москалёнок Андрей Сергеевич | 77 | Брель Дмитрий Николаевич |
| 10 | Мархотко Виктория Владимировна | 44 | Романова Анна Владимировна | 78 | Зайцева Светлана Михайловна |
| 11 | Кислов Александр Сергеевич | 45 | Пометько Юлия Владиславовна | 79 | Алексеенко Дарья Николаевна |
| 12 | Шулейко Людмила Иосифовна | 46 | Кузнецов Вячеслав Леонидович | 80 | Волковец Елена Александровна |
| 13 | Атрощенко Татьяна Владимировна | 47 | Веракса Сергей Николаевич | 81 | Калякина Наталья Владимировна |
| 14 | Барановская Светлана Николаевна | 48 | Сенько Максим Викторович | 82 | Игнатюк Андрей Иванович |
| 15 | Каптур Ольга Ивановна | 49 | Ильенков Сергей Николаевич | 83 | Лобан Светлана Александровна |
| 16 | Климович Наталья Петровна | 50 | Соловьян Ольга Николаевна | 84 | Голдин Алексей Евгеньевич |
| 17 | Булатова Елена Олеговна | 51 | Вербицкий Вадим Евгеньевич | 85 | Конухова Ольга Михайловна |
| 18 | Борков Антон Петрович | 52 | Шкода Валерия Владимировна | 86 | Щигло Евгений Иванович |
| 19 | Сацук Алеся Николаевна | 53 | Драпей Янина Андреевна | 87 | Ленковский Валерий Владимирович |
| 20 | Ляховец Кристина Дмитриевна | 54 | Маклакова Анастасия Андреевна | 88 | Артамонова Екатерина Владимировна |
| 21 | Макаров Андрей Владимирович | 55 | Домасевич Алексей Дмитриевич | 89 | Жарская Светлана Сергеевна |
| 22 | Маркевичус Екатерина Анатольевна | 56 | Лукьянова Елена Анатольевна | 90 | Сенько Оксана Владимировна |
| 23 | Падольницкая Татьяна Сергеевна | 57 | Лаберко Анастасия Александровна | 91 | Рудинский Александр Сергеевич |
| 24 | Сергеев Сергей Викторович | 58 | Никитенко Дарья Александровна | 92 | Прохорский Сергей Александрович |
| 25 | Грек Светлана Николаевна | 59 | Трухина Марина Петровна | 93 | Манзюк Никита Сергеевич |
| 26 | Шершень Александр Сергеевич | 60 | Шупиков Алексей Васильевич | 94 | Бирюков Александр Юрьевич |
| 27 | Балабина Инна Валентиновна | 61 | Колос Валерия Сергеевна | 95 | Акперова Ольга Витальевна |
| 28 | Пискун Татьяна Олеговна | 62 | Ревенько Юлия Михайловна | 96 | Еникова Елена Леонидовна |
| 29 | Напеленок Андрей Алексеевич | 63 | Михайлов Дмитрий Сергеевич | 97 | Вайгандт Алевтина Сергеевна |
| 30 | Реентович Наталья Николаевна | 64 | Борисенко Полина Алексеевна | 98 | Казанцев Егор Евгеньевич |
| 31 | Купрейчиков Олег Леонидович | 65 | Германович Александр Вячеславович | 99 | Мажушинский Олег Александрович |
| 32 | Силич Екатерина Сергеевна | 66 | Шахова Екатерина Николаевна | 100 | Бадыль Юлия Викторовна |
| 33 | Парахина Ирина Сергеевна | 67 | Гетченко Александр Николаевич | | |
| 34 | Резаева Александра Юрьевна | 68 | Фисенко Павел Сергеевич | | |

Победителями 100 (ста) призов «Сумка пляжная «Sylt» полиэстер, синий/белый» стали:

| № | ФИО | № | ФИО | № | ФИО |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Лешкевич Антон Николаевич | 35 | Грика Наталья Сергеевна | 69 | Новик Галина Николаевна |
| 2 | Осипенко Елена Даниловна | 36 | Каримкулов Роберт Александрович | 70 | Куц Михаил Михайлович |
| 3 | Шашок Юрий Николаевич | 37 | Будич Евгений Олегович | 71 | Козловский Алексей Александрович |
| 4 | Лозикова Натали Николаевна | 38 | Олешкевич Галина Витальевна | 72 | Лагодский Александр Викторович |
| 5 | Кушнарёв Дмитрий Николаевич | 39 | Коголь Алексей Александрович | 73 | Романенко Анастасия Вадимовна |
| 6 | Майстрович Татьяна Георгиевна | 40 | Маевская Ирина Фёдоровна | 74 | Миронович Алексей Александрович |
| 7 | Можейко Александр Фёдорович | 41 | Буткевич Светлана Казимировна | 75 | Шатыко Ирина Александровна |
| 8 | Андреенко Светлана Дмитриевна | 42 | Якубенок Анастасия Анатольевна | 76 | Митяшов Владислав Сергеевич |
| 9 | Ивашкевич Александр Евгеньевич | 43 | Лазовский Василий Александрович | 77 | Галицкая Сабина Васильевна |
| 10 | Щуцкий Алексей Александрович | 44 | Резанович Игорь Александрович | 78 | Бондарева Ольга Викторовна |
| 11 | Щербин Игорь Михайлович | 45 | Шалухо Лидия Сергеевна | 79 | Нехай Александр Васильевич |
| 12 | Сижук Андрей Петрович | 46 | Штунь Сергей Александрович | 80 | Кузнецов Максим Игоревич |
| 13 | Зинкин Алексей Геннадьевич | 47 | Дашковец Иван Владимирович | 81 | Хомякова Инна Валерьевна |
| 14 | Юдицкая Марина Юрьевна | 48 | Немшон Дмитрий Юрьевич | 82 | Богдан Екатерина Александровна |
| 15 | Иваненко Елена Владимировна | 49 | Кашеваров Дмитрий Юрьевич | 83 | Оскирко Александр Геннадьевич |
| 16 | Козлов Александр Евгеньевич | 50 | Савенок Яна Владиславовна | 84 | Терехов Кирилл Николаевич |
| 17 | Марус Артур Владимирович | 51 | Дудко Наталия Александровна | 85 | Корделюк Алексей Анатольевич |
| 18 | Дриго Елена Александровна | 52 | Власова Анастасия Александровна | 86 | Богейша Ангелина Владимировна |
| 19 | Писаренко Григорий Леонидович | 53 | Хаменкова Наталья Семеновна | 87 | Логунович Юлия Васильевна |
| 20 | Гучек Екатерина Александровна | 54 | Никишова Вероника Александровна | 88 | Русакевич Анастасия Вадимовна |
| 21 | Кардовская Наталья Владимировна | 55 | Шульженко Олег Николаевич | 89 | Карабанюк Андрей Петрович |
| 22 | Мирончик Алина Юрьевна | 56 | Масловская Марта Геннадьевна | 90 | Литвинов Владимир Викторович |
| 23 | Федоренко Юрий Анатольевич | 57 | Третьякова Людмила Михайловна | 91 | Луговцова Анастасия Юрьевна |
| 24 | Гуляй Екатерина Романовна | 58 | Маслова Анастасия Валерьевна | 92 | Клименко Андрей Сергеевич |
| 25 | Сычевич Юрий Иванович | 59 | Шляжко Евгений Владимирович | 93 | Ходуньков Александр Евгеньевич |
| 26 | Кахель Любовь Александровна | 60 | Наварич Дмитрий Алексеевич | 94 | Рашидов Абубакр Хамидхонович |
| 27 | Пинчук Александр Викторович | 61 | Михед Ольга Сергеевна | 95 | Васюк Оксана Валерьевна |
| 28 | Лыжанов Виктор Викторович | 62 | Орлова Светлана Борисовна | 96 | Голуб Марина Федоровна |
| 29 | Соколов Николай Владимирович | 63 | Щуровская Виктория Дмитриевна | 97 | Чирков Николай Александрович |
| 30 | Иваньков Андрей Александрович | 64 | Николаенко Мальвина Александровна | 98 | Гвоздь Александр Юрьевич |
| 31 | Соловьева Светлана Евгеньевна | 65 | Климчук Наталья Васильевна | 99 | Шенец Наталья Владимировна |
| 32 | Михалькевич Дарья Александровна | 66 | Бородич Кристина Юрьевна | 100 | Сергиевич Екатерина Александровна |
| 33 | Сабко Алеся Владимировна | 67 | Можайко Владимир Валерьевич | | |
| 34 | Насонова Елена Михайловна | 68 | Мезяк Татьяна Николаевна | | |

Победителями 90 (девяноста) призов «Рюкзак д/ноутбука 15» «Glaze» полиэстер, серый» стали:

| № | ФИО | № | ФИО | № | ФИО |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Ястремская Анастасия Андреевна | 31 | Кулеш Павел Иванович | 61 | Шляжко Евгений Владимирович |
| 2 | Воробьева Елена Алексеевна | 32 | Шершень Александр Сергеевич | 62 | Титюра Юрий Владимирович |
| 3 | Якубович Наталья Петровна | 33 | Михалькевич Дарья Александровна | 63 | Германович Александр Вячеславович |
| 4 | Майстрович Татьяна Георгиевна | 34 | Шевелёва Елена Юрьевна | 64 | Гетченко Александр Николаевич |
| 5 | Гореленкова Ольга Анатольевна | 35 | Дайнеко Наталья Васильевна | 65 | Баранова Елена Николаевна |
| 6 | Дмитриева Юлия Александровна | 36 | Прокопцов Дмитрий Александрович | 66 | Малащенко Екатерина Николаевна |
